Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 МАЯ 2018 г. СЕРАДА № 101 (28717)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**І ў інфармацыйным грамадстве застаца чалавекам...**

СТАР. 6



**Адзін паштальён варты пяцярых**

СТАР. 8



**Як не нашкодзіць шчытападобнай залозе**

СТАР. 11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

*«Мытная сістэма ў 2018 годзе актыўна працуе над навеламі як у галіне заканадаўства, так і ў сферы тэхналогій мытнага афармлення. За чатыры месяцы гэтага года мы сабралі на $315 млн больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Рост склаў каля 15 %. Пры ўзрослым патоку аўтамабіляў беларускія мытнікі пасяхова спраўляюцца са сваімі задачамі. За студзень — красавік 2018 года праз мытную мяжу краіны прайшлі больш за 2,6 млн аўтамабіляў і каля 40 млн тон тавараў. Сёлета каля 87 % партый тавараў, што вывозіліся з мытнай тэрыторыі ЕАЭС, выпушчаны беларускімі мытнікамі менш чым за 10 хвілін».*

# У ПАДМУРКУ АДНОСІН — ДАВЕР І СЯБРОЎСТВА



Фота БелТА.

**Даверныя асабістыя кантакты паміж кіраўніцтвам Беларусі і Кітая з кожнай новай сустрэчай на высокім узроўні толькі мацнеюць. Плануецца, што ўжо ў чэрвені адбудзецца візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітай, горад Цындаа, дзе пройдзе саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, на палях якога плануецца сустрэча кіраўніка беларускай дзяржавы са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам. Таму прыезд другой асобы ў іерархіі КНР — намесніка старшыні КНР Ван Цішаня ў нашу краіну з трохдзённым візітам выглядае цалкам лагічна.**

Як і сустрэча высокага госця з Прэзідэнтам Беларусі ў нефармальнай абстаноўцы: так вітаюць самых блізкіх і паважаных сяброў. У загараднай рэзідэнцыі кіраўніка нашай дзяржавы Ван Цішань падзяліўся ўражаннямі ад наведвання Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» і высока ацаніў перагаворы, якія прайшлі ва ўрадзе Беларусі. Пасля Аляксандр Лукашэнка і Ван Цішань наведалі мясцовую крыніцу і ў чайным доміку за кітайскай гарбатай з беларускім варэннем абмеркавалі сітуацыю ў свеце і міжнародныя адносіны.

СТАР. 2



**Фёдар ПАВУКОЎ — жыхар вёскі Ляхі, вучань Арэхаўскай школы Ушацкага раёна, першы памочнік бацькам па доглядзе гаспадаркі. На адказнасці юнака — клопат і аб адзінай у вёсцы рагулі.**

# Малады гаспадар

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

«Жывіце ў бяспецы!»

# КАЛІ ДА ПАЖАРУ — АДНА КРОПЛЯ

## Як абыходзіцца з «гаручым»?

**Бензін, салярка, уайт-спірыт, разнастайныя аэразолі даўно і трывала ўвайшлі ў наша жыццё. Але калі імі карыстацца няправільна, то ёсць велізарныя шанцы трапіць у зводку здарэнняў да ратаўнікоў. А пакольк адлік ідзе на секунды — то яшчэ і зарабіць вялізныя апёкі.**

На пазамінулым тыдні 40-гадовы мужчына на прыватным падворку ў вёсцы Ляхавічы Дзяржынскага раёна спальваў смецце ў металічнай бочцы. А каб яно лепш гарэла, вырашыў падліць паліва ў агонь. Змесціва бутэлькі трапіла на вопратку — і адбылося ўзгаранне. 20 мая мужчына пастуціў у бальніцу з дыягназам «тэрмічныя апёкі полымем ніжніх канечнасцяў, пярэдняй брушной сценкі, левай рукі 1—3 ступені. Сумарна ён апёк каля 10 % плошчы паверхні цела.

Літаральна ў тыя ж дні няшчасны выпадак адбыўся ў Мінскім раёне. Тады 62-гадовы мужчына ў вёсцы Узбор'е атрымаў апёкі падчас спальвання смецця. Праўда, гэтае здарэнне адбылося з-за непрыкрытай неахайнасці. У полымя ён закінуў ёмістасць з невядомай вадкасцю. І тут жа прагучаў выбух. З дыягназам «тэрмічныя апёкі полымем верхніх і ніжніх канечнасцяў 1—3 ступені» яго шпіталізавалі ў бальніцу. Але тут полымя апякло ўжо 20 % паверхні цела.

Зусім свежы выпадак адбыўся 24 мая. У прыёмны пакой Маладзечанскай цэнтральнай раённай бальніцы прыйшоў пятнаццацігадовы падлетак, які атрымаў апёкі цела. Пазней стала вядома, што ён распальваў у гаражы печ і выкарыстоўваў гаручае. Па́ра ўспыхнула — так падлетак і атрымаў траўму. На шчасце, гэтая гісторыя скончылася адносна добра — хлопец атрымаў тэрмічныя апёкі галавы 1-й ступені (сумарна — 3 % цела) і быў адпушчаны дадому.

СТАР. 12

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# ЗВЕРКА ГАДЗІННІКАЎ

**Падрыхтоўку да Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы абмеркавалі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы прапанаваў абмеркаваць парадак дня ў свеце і намеціць перспектывы супрацоўніцтва ў міжнародным плане.**

«Заўсёды прыводжу як прыклад і ўзор для ўсіх нашых ведамстваў, і беларускіх, і расійскіх, супрацоўніцтва паміж міністэрствамі замежных спраў Беларусі і Расіі, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка напачатку размовы. — Вы заўсёды знаходзіце ўзаемаразуменне, заўсёды плануеце і выконваеце планы ў адрозненне ад многіх планаў, якія ў нас маюцца ў розных, у тым ліку інтэграцыйных, структурах». Звяртаючыся да тэмы Вышэйшага дзяржсавета, Прэзідэнт адзначыў, што трэба яшчэ раз абмеркаваць дэталі гэтага мерапрыемства, удакладніць, калі трэба, даты. «У нас, беларускага боку, пакуль няма ніякіх змяненняў у дачыненні да гэтага. Калі ёсць нейкія ў расійскага боку пытанні, мы гатовыя абмеркаваць, паколькі ведаю, што вы перажываеце няпросты перыяд фарміравання і ўваходжання ў нармальны рытм работы ўрада. Гэта таксама вельмі важны момант».

Сяргей Лаўроў перадаў кіраўніку беларускай дзяржавы прывітанне ад Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. Кіраўнік расійскага знешнепалітычнага ведамства адзначыў, што ў ходзе падрабязных даверных перагавораў, якія пачаліся яшчэ напярэдадні з яго беларускім калегам Уладзімірам Макеем, была абмеркавана падрыхтоўка да Вышэйшага дзяржсавета. Сяргей Лаўроў растлумачыў, што пакуль перашкод, якія б прымусілі мяняць падыход да гэтага мерапрыемства, няма, але неабходна яшчэ пацвердзіць дату і парадак дня. «Важна, што выносіцца на зацвярджэнне вельмі сур'ёзны стратэгічны дакумент — прыярытэтныя напрамкі і далейшыя задачы развіцця Саюзнай дзяржавы да 2022 года ўключна. І, вядома ж, мы па лініі міністэрстваў дамовіліся трымаць пад шчыльным кантролем усю работу, у якой задзейнічаны і іншыя ведамствы ўрадаў нашых дзвюх краін. Разгледзелі мы сёння і цэлы шэраг іншых пытанняў нашага ўзаемадзеяння, у тым ліку па выніках сумеснай калегіі двух знешнепалітычных ведамстваў, якая прайшла ў лістападзе мінулага года. І абмяркавалі падрыхтоўку да чарговай калегіі, якая таксама восенню адбудзецца», — паведаміў міністр замежных спраў Расіі.

***

Па выніках перагавораў з Сяргеем Лаўровым міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей адзначыў, што бакі абмеркавалі развіццё міжнароднай абстаноўкі ў глабальным і рэгіянальным маштабе, праблематыку бяспекі і актуальныя пытанні двухбаковых адносін. Акрамя таго, удзялілі сур'ёзную ўвагу графіку і змястоўнаму напаўненню меркаваных адбыцца сустрэч у розных фарматах. «Ва ўмовах цяперашніх сур'ёзных палітычных і эканамічных выклікаў асабліва запатрабавана каардынацыя намаганняў Беларусі і Расіі на міжнароднай арэне», — падкрэсліў Уладзімір Макей. Бакі падпісалі пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі аб некаторых пытаннях, звязаных з уездам замежных грамадзян і асоб без грамадзянства на міжнародныя спартыўныя мерапрыемствы. Дакументам устанаўліваюцца бязвізавы рэжым на тэрыторыі Беларусі з 4 чэрвеня па 25 ліпеня 2018 года для замежных балельшчыкаў на перыяд правядзення чэмпіянату свету па футболе ў Расіі, а таксама бязвізавы праезд і знаходжанне на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі для замежных балельшчыкаў, якія едуць на II Еўрапейскія гульні ў Мінск.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

**Пасля размовы з Прэзідэнтам Беларусі міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў расказаў, якія моманты яшчэ былі абмеркаваны з кіраўніком беларускай дзяржавы:**

— Гаварылі мы сёння аб нашых эканамічных праектах, якія развіваюцца вельмі і вельмі паспяхова. Таксама аб неабходнасці пераадольваць тыя праблемы, якія непазбежна ўзнікаюць, калі настолькі вялікі аб'ём сувязяў у гандлі, у эканоміцы, у інвестыцыйнай сферы, у сферы прамысловай кааперацыі. Гаварылі, вядома ж, і аб адносінах паміж нашымі краінамі з аднаго боку і Еўрасаюзам і Паўночнаатлантычным альянсам з другога. У нас адзіная пазіцыя, мы саюзнікі, мы не шукаем ні з кім канфрантацыі, жадаем развіваць раўнапраўныя ўзаемапаважлівыя адносіны на аснове прынцыпаў узаемнай карысці і роўнай непадзельнай бяспекі, калі ніхто не выбудоўваў бы сваю бяспеку на шкоду бяспецы іншых. На такіх асновах мы гатовыя весці дыялог з усімі без выключэння краінамі, у тым ліку дыялог, які зараз пачынае актыўна развівацца паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і замежнымі партнёрамі. Усе больш і больш краін, якія зацікаўлены ў падпісанні пагаднення аб свабодным гандлі з Еўразійскім эканамічным саюзам. І Расія, і Рэспубліка Беларусь, як сёння было пацверджана на нашай сустрэчы з Прэзідэнтам Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам, будуць рабіць усё, каб Еўразійскі эканамічны саюз умацняўся і развіваўся ў тым ліку і ў плане пашырэння геаграфіі партнёрскіх адносін з замежнымі краінамі. Але не толькі краінамі — і з інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, такімі як МЕРКАСУР у Лацінскай Амерыцы, як Афрыканскі саюз, як АСЕАН у Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне.

# КАЛІ ЦЯГНІК ДА БАЛІВІІ ДАЕДЗЕ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора сустрэўся са старшынёй савета дырэктараў і ўладальнікам групы кампаній «Штадлер» Петэрам Шпулерам. Кіраўнік дзяржавы ўспомніў іх першую сустрэчу і абмеркаваў прапановы па новай будоўлі.**

«Яна (вытворчасць. — **Аўт.**) працуе выдатна, як я інфармаваны, загрузка прадпрыемства ёсць, і планы па загрузцы павялічваюцца, — адзначыў Прэзідэнт. — І ведаю, што вы гатовыя прапанаваць новую будоўлю, новае прадпрыемства ці пашырэнне прадпрыемства. І для мяне гэта вельмі цікава».

Спадар Шпулер адзначыў, што з апошняй сустрэчы, якая прайшла 1 жніўня 2016 года, адбыўся шэраг пазітыўных зменаў. У тым ліку быў атрыманы заказ ад «Аэраэкспрэса» ў Маскве, чые рэйсы злучаюць тры аэрапорты з цэнтрам горада. Цягнікі, выраблены ў Беларусі, зараз выконваюць гэтую важную задачу. Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Петэр Шпулер пракаментаваў для журналістаў нюансы гэтай здзелкі. Усяго было выраблена 24 двухпавярховыя саставы. Але з-за эканамічнага спаду заказчык змог набыць толькі 11 з іх. Тым не менш пакупнік быў знойдзены: дзевяць цягнікоў накіраваныя ў Азербайджан, а яшчэ чатыры — у Грузію.

Кіраўніцтва «Штадлера» тлумачыць, што бачыць патэнцыял і магчымыя змяненні на рынку СНД. Акрамя таго, іх цікавяць краіны Цэнтральнай Еўропы, куды ўжо былі пастаўкі. Не так даўно прадпрыемства выйграла тэндар на пастаўку трамваяў у Балівію. Уся партыя будзе створана ў Фаніпалі, і гэта першы заказ з Лацінскай Амерыкі.

Што датычыцца новай вытворчасці, Петэр Шпулер растлумачыў, што размова ідзе пра вытворчасць ператваральнікаў. Яны будуць у тым ліку экспартавацца ў краіны Заходняй Еўропы як асобны прадукт. Таксама плануецца пашырыць ужо існуючую вытворчасць вагонных кузаваў да 300 адзінак. Разам два праекты патрабуюць каля 25 мільёнаў еўра інвестыцый. А на наступным этапе ў планах пашырыць вытворчасць вагонных кузаваў да 450 адзінак у год. Гэта яшчэ 11 млн еўра. Дарэчы, на 1 мая з моманту пачатку рэалізацыі інвестыцыйнага праекта ў асноўны капітал «Штадлер Мінск» укладзена 83,8 млн рублёў.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# У ПАДМУРКУ АДНОСІН — ДАВЕР І СЯБРОЎСТВА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Размова ж аб двухбаковых адносінах прадоўжылася за вячэрай у беларускім стылі. Госцю прапанавалі дранікі, беларускія пельмені і качку. А на дэсерт Прэзідэнт пачаставаў высокага госця сваёй фірменнай стравай — тварожнымі батончыкамі з марожаным і клубніцамі. Выбар страў, якія падаваліся на вячэры, быў зроблены па кітайскай традыцыі, але з беларускім каларытам. Напрыклад, замест вядомых у Кітаі пельменяў з рысавай мукі прыгатавалі беларускія з пшанічнай.

Лагічна такая «цёплая» актывізацыя кантактаў глядзіцца і на фоне планаў, якія раней агучваліся беларускім бокам: да сярэдзіны гэтага года павінны павялічыцца пастаўкі беларускай малочнай і мясной прадукцыі. **Кірыл РУДЫ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Кітаі,** адзначае, што ў канцы мінулага года былі падпісаны кантракты на пастаўку ў КНР беларускай малочнай і мясной прадукцыі на $114 млн, і цяпер іх жыццёва важна паспяхова рэалізаваць. «У 2017 годзе былі пастаўкі на $15 млн, у 2016-м — на $5 млн. Калі мы рэалізуем прадукцыі на $114 млн, гэта будзе прарыў», — лічыць ён.

У студзені — красавіку 2018 года экспарт беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання сапраўды паказаў рост: $5,6 млн, або 133,2 % да адпаведнага перыяду мінулага года. Да таго ж днямі Беларусь адправіла першую прамысловую партыю ялавічыны ў Кітай, паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Аляксей БАГДАНАЎ.** «Акрамя таго, ужо законтрактаваная і ў найбліжэйшы час адправіцца кітайскаму спажыўцу зборная партыя малочнага грузу — сыры, глазураваныя сыркі, пакетаванае малако і тварожная паста. Таксама кітайская кампанія «Валоша» рыхтуецца заключыць кантракты з беларускімі птушкафабрыкамі», — дадаў ён.

З 2013-га амаль кожны год Кітай уваходзіць у тройку найбуйнейшых знешнегандлёвых партнёраў нашай краіны. Звычайна самымі прыбытковымі артыкуламі беларускага экспарту ў Кітай (па даных за 2016 год) з'яўляюцца калійныя ўгнаенні, поліаміды і лён. І тое, што зараз наменклатура паставак пашыраецца — безумоўна станоўчы факт. Галоўнае, калі ў нас зараз так удала складваюцца адносіны, своечасова трапіць на гэтую «хвалю» і скарыстацца магчымасцю стаць патрэбнымі кітайскаму рынку.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# У працяг тэмы бяспекі

**Учора па ініцыятыве аўстрыйскага боку адбылася тэлефонная размова паміж Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам і федэральным канцлерам Аўстрыі Себасцьянам Курцам.**

Апошні расказаў беларускаму лідару пра змены ў палітычным полі Аўстрыі, а Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Себасцьяна Курца з прызначэннем на пасаду федэральнага канцлера. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы прыняў запрашэнне наведаць Аўстрыю і запрасіў федэральнага канцлера прыехаць у Беларусь у суправаджэнні дзелавых колаў.

Асобна бакі падчас размовы абмеркавалі міжнародны форум «Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх» экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог», які адбудзецца ў Мінску. Себасцьян Курц адзначыў станоўчыя вынікі канферэнцыі. Таксама пагаварылі пра сустрэчу асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы, якая запланавана да правядзення восенню гэтага года ў нашай краіне. Дарэчы, федэральны канцлер выказаў гатоўнасць падтрымаць і аказаць дапамогу па ўсіх напрамках у падрыхтоўцы гэтага мерапрыемства.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў пазітыўную дынаміку ў развіцці беларуска-аўстрыйскіх адносін, выказаў надзею на працяг канструктыўнага ўзаемадзеяння. Яшчэ бакі абмеркавалі супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах, бо Аўстрыя трывала ўвайшла ў лік вядучых інвестыцыйных партнёраў Беларусі. У ходзе гутаркі была закранута тэма функцыянавання беларускага сектара тэлекамунікацый — у прыватнасці работы кампаніі velcom, якая з'яўляецца дачыннай кампаніяй аўстрыйскага холдынга Telekom Austria AG.

**Паводле БелТА.**

■ Форум

# Прамкампаніі з 11 краін сабраліся ў Мінску

**У краіне створаны ўмовы для развіцця прамысловасці за кошт інвестыцый і інавацый. Пра гэта падчас цырымоніі адкрыцця Беларускага прамысловага форуму ў мінскім Футбольным манежы заявіў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА. Паводле яго слоў, тэмп росту прамысловай вытворчасці за студзень — красавік сёлета ў Беларусі склаў 108,8 %. Ва ўрадзе разлічваюць, што на аналагічным паказчыку будзе скончаны гэты год.**

Кажучы аб прамысловым форуме, віцэ-прэм'ер адзначыў, што гэтае мерапрыемства ўжо зарэкамендавала сябе як пляцоўка, дзе спецыялісты могуць абмяняцца думкамі, прадэманстраваць свае дасягненні і выгадна прадаць распрацоўкі.

Беларускі прамысловы форум праходзіць у сталіцы з 29 мая па 1 чэрвеня. Цэнтральнае месца тут займае XXI Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «ТэхІнаПрам», дзе абмяркоўваецца тэма чацвёртай прамысловай рэвалюцыі (Industry 4.0). На форуме прадстаўлены экспаненты з 11 краін.

Мінпрамам сумесна з НАН Беларусі і Мінскім гарвыканкамам запланавана спецыялізаваная экспазіцыя, прысвечаная развіццю легкавога аўтамабілебудавання, вытворчасці электрамабіляў і рынку аўтакампанентаў. «Кіруючая кампанія холдынга «Белкамунмаш» разам са «Штадлер Мінск» арганізуюць у павільёне і на адкрытай пляцоўцы «ТэхІнаПрам» сумесную экспазіцыю сучасных і перспектыўных транспартных сродкаў і сістэм, накшталт электробусаў, хуткасных трамваяў, найноўшых тралейбусаў, аўтобусаў з дызельным і газаматорным рухавікамі, рухомых чыгуначных саставаў, вагонаў метро.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ** ■

■ Конкурс

# ДА ЗАПАВЕТНЫХ ВЫШЫНЬ

## Выбраны найлепшыя апавяданні, дасланыя ў «Звязду»

**Адзін з адметных праектаў, якія выходзяць на старонках нашай газеты, — гэта конкурс апавяданняў. Мы атрымліваем дастаткова шмат вашых допісаў, выкананых у гэтым жанры, і самае лепшае публікуем на старонках выдання. Тым самым імкнёмся намацаць і падтрымаць планку добрай літаратуры. Дзякуй усім, хто паўдзельнічаў у конкурсе: лічым, што такая спроба — гэта ўжо перамога. Але вызначыць тройку (нават чацвёрку!) найлепшых нам усё-такі давялося — і мы зрабілі гэта з прыемнасцю! Дарэчы, сёлета гэта рабіла надзвычай кампетэнтнае журы, якое ўзначаліў вядучы конкурсу Алесь Бадак, вядомы пісьменнік, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура». А чыталі і судзілі конкурсныя творы галоўныя рэдактары літаратурна-мастацкіх выданняў нашага Выдавецкага дома: Аляксей Чарота («Нёман»), Ларыса Цімошык («ЛіМ»), Алена Мальчэўская («Полымя»), Святлана Воцінава («Маладосць»).**



Такім чынам, першае месца ў конкурсе апавяданняў заняла **Кацярына ЗАХАРЭВІЧ**, з чым мы яе і віншуем! Аўтарка рэгулярна друкуецца і на старонках часопіса «Маладосць» — таму, нягледзячы на малады ўзрост, паспела зразумець, што патрэбна чытачу, і адшліфаваць майстэрства. Вось што ў прадмове да апавядання Кацярыны Захарэвіч **«Морзэ на барвовай труне»** адзначыў Алесь Бадак: «Маладосць — не загана, а ў літаратурнай творчасці і пагатоў. І думаецца, што такое нестраёвае, светла-шчымлівае апавяданне, якое Кацярына даслала на конкурс «Звязды», можна напісаць толькі ў маладым узросце, калі яшчэ жыве ў душы своеасаблівае, дзівоснае, ні з чым не параўнальнае адчуванне характва свету, на які пасля, набываючыся таго самага жыццёвага вопыту, мы ўсё часцей глядзім цераз прызму сваіх шматлікіх праблем і клопатаў». Усе члены журы былі аднагалосныя ў тым, што гэтым разам Кацярына Захарэвіч аказалася найлепшай.

Другое месца — у **Марыі ШЭБАНЕЦ** (яна ж — Марыя Бельская). Не так даўно ў яе выйшла дэбютная кніга вершаў «Таямніца». І вось ужо даволі ўпэўнена яна заяўляе аб сабе як малады празаік. Аўтарка кажа, што з 12 гадоў пачала спрабаваць сябе ў літаратуры. Яна шмат чытае з дзяцінства, таму акурат кнігі іншых натхнілі яе, каб штосьці стварыць самой. У будучыні яна плануе напісаць раман. Вось што кажа з гэтай нагоды Алесь Бадак: «Што ж, можа, якраз перамога апавядання **«Краем вока»** ў конкурсе «Звязды» і стане «апошнім штуршком», каб пачаць гэты самы раман? Пакуль жа ў творчым асяроддзі Марыя больш вядомая як паэтка, Марыя Бельская. Змена прозвішча — як пачатак новага этапу, у дадзеным выпадку, вядома, гаворка ідзе пра заняцце літаратурнай справай. І вершы Марыі Бельскай сваім светабачаннем, мяккай лірычнасцю, сапраўды, вельмі не падобныя на фантастычную, сюжэтна напружаную прозу Марыі Шэбанец».

Трэцяе ганаровае месца журы вырашыла прысудзіць **Сяргею БЕЛАЯРУ**, з чым мы яго і віншуем. Яго касмічныя матывы ў апавяданні **«Спадарожнік»** не пакінулі абыякавымі членаў журы. Яны, відаць, таксама марачы пабываць дзесьці ў далёкіх галактыках, абралі гэтага аўтара ў тройку лідараў. Вось што адзначае Алесь Бадак: «Сяргей Белаяр скончыў гістарычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна, але калі вырашыў паспрабаваць свае сілы ў літаратурнай творчасці, то думкамі накіраваўся не ў сівую мінуўшчыну, а ў далёкі космас. І трэба прызнаць, што тут ён знайшоў сябе як творцу, пра што сведчаць яго перамогі ў розных літаратурных конкурсах». Такім чынам, да ліку перамог можна дадаць яшчэ адну — як не бачаную раней зорку да карты начнога неба.

Спыніцца на тройцы лідараў членам журы ўсё ж такі не ўдалося. Было вырашана прысудзіць яшчэ і заахвочвальны прыз. Яго атрымлівае **Святлана ЛАКТЫШ** за твор **«Цыркачы»**. У яе апавяданні разгортваецца няпросты свет узаемаадносін блізкіх людзей, а ўсе дзеянні адбываюцца... у судзе! У гэтым даволі невялікім творы па-майстэрску паспявае разгарнуцца досыць закручаны сюжэт. Здрады, адкрыццё таямніц, прызнанні — усё гэта можна знайсці ў творы. «Апавяданне «Цыркачы» найперш звяртае на сябе ўвагу сацыяльнай і маральнай завостранасцю, — адзначае старшыня журы, — пераконваючы чытача ў тым, што і «тысяча першы» рэцэпт, як пазбавіцца ад нялюбага мужа, звычайна прыводзіць да сумнага фіналу, калі дзеля дасягнення мэты даводзіцца ісці на злачынства». Вось такая проза жыцця стала добрай літаратурнай прозай.

Дзякуем усім, хто даслаў свае апавяданні на конкурс «Звязды». Упэўнены, што кожная новая спроба — гэта крок наперад. І адзін з іх абавязкова апынецца на вяршыні. А сёлетніх пераможцаў яшчэ раз віншуем з іх вікторыяй! І неўзабаве чакаем на ўзнагароджванне ў рэдакцыю «Звязды».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Прыёмная кампанія — 2018

# АБІТУРЫЕНТАМ ВАРТА ПАСПЯШАЦЦА

**Да завяршэння рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне засталіся лічаныя дні. 1 чэрвеня ў 19 гадзін пункты рэгістрацыі закрыюцца. Усе каналы сувязі па аплаце ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні і адзіны банк даных удзельнікаў ЦТ будуць закрыты. Таму тым, хто яшчэ не знайшоў час, каб запасціся пропускамі на ЦТ, варта паспяшацца.**

Як расказаў журналісту «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК**, на вечар панядзелка свой намер удзельнічаць у цэнтралізаваным тэсціраванні афармілі ўжо каля 70 тысяч абітурыентаў. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года адставанне складае прыблізна 6 тысяч чалавек. Традыцыйна самай масавай дысцыплінай на ЦТ будзе руская мова — на яе зарэгістраваліся ўжо 56,5 тысячы чалавек. Для параўнання: беларускую мову выказалі жаданне здаваць 21,2 тысячы абітурыентаў. Другой па папулярнасці дысцыплінай будзе матэматыка (38,2 тысячы). На фізіку аформлена ўжо 21,5 тысячы пропускаў, на біялогію — 23,2 тысячы, на англійскую мову — 23,6 тысячы.

18,8 тысячы абітурыентаў ужо зарэгістраваліся на ЦТ па гісторыі Беларусі, пры гэтым здаваць гісторыю на роднай мове будуць толькі 6,3 % ад агульнай колькасці тых, хто прайшоў рэгістрацыю.

Трэба заўважыць, што ў абітурыентаў ужо другі год ёсць права здаваць на ЦТ чатыры дысцыпліны замест трох. Юрый Міксюк паведаміў, што на кожнага абітурыента прыпадае ў сярэднім 3,4 тэста. Хтосьці вырашыў здаваць і рускую, і беларускую мовы, каб потым выбраць лепшы з двух сертыфікатаў.

У некаторых ВНУ ўжо цалкам запоўніліся месцы, выдзеленыя для праходжання абітурыентамі цэнтралізаванага тэсціравання па тых ці іншых прадметах. Напрыклад, у БДПУ ўжо немагчыма трапіць на рускую мову, біялогію і гісторыю Беларусі. Але аўтаматызаваная сістэма рэгістрацыі працуе па прынцыпе «аднаго акна»: сама шукае свабодныя пасадачныя месцы і падказвае рэгістратару, у якіх навучальных установах можна здаць тыя ці іншыя прадметы. Асабліва гэта актуальна для сталіцы.

Да завяршэння рэгістрацыі, гэта значыць да 1 чэрвеня, у абітурыента ёсць права змяніць «камплект» экзаменацыйных дысцыплін. Для гэтага трэба звярнуцца ў пункт рэгістрацыі з пропускам па тым прадмеце, які трэба замяніць, і афарміць пропуск для ўдзелу ў ЦТ па іншай дысцыпліне. У выпадку страты пропуска на ЦТ таксама трэба звяртацца ў пункт рэгістрацыі, каб атрымаць яго дублікат.

Калі па ўважлівай прычыне ў абітурыента не будзе магчымасці прыняць удзел у тэсціраванні ў асноўныя дні, ён зможа зрабіць гэта ў рэзервовыя (6, 8 і 10 ліпеня). Рэгістрацыя — з 30 чэрвеня па 3 ліпеня. Але да здачы тэст-іспытаў у рэзервовы дзень будуць дапушчаны толькі тыя абітурыенты, якія зарэгістраваліся ў вызначаныя тэрміны (гэта значыць, з 2 мая па 1 чэрвеня) і змогуць даказаць, што ў іх былі сур'ёзныя прычыны для пропуску экзамену.

Традыцыйна з 1 чэрвеня ў Міністэрстве адукацыі пачне працаваць гарачая лінія для абітурыентаў. З пытаннямі па правядзенні ўступнай кампаніі можна будзе звярнуцца па тэлефоне (8 017) 222 43 12 і атрымаць кваліфікаваны адказ ад спецыяліста з першых вуснаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ПАЛЕСЦІНСКІЯ РАДЫКАЛЫ АБСТРАЛЯЛІ ПОЎДЗЕНЬ ІЗРАІЛЯ

Радыкалы з сектара Газа запусцілі не менш за 25 ракет і снарадаў па паўднёвых раёнах Ізраіля раніцай у аўторак, паведаміла прэс-служба Арміі абароны Ізраіля.

«Залп з 25 ракет і снарадаў быў зроблены па некалькіх раёнах на ізраільскай тэрыторыі, — адзначылі ваенныя. — Большая частка з іх была перахопленая сістэмай ППА «Жалезны купал». Па даных газеты The Times of Israel, у выніку ракетнага абстрэлу пацярпелых няма.

### У ЕЎРАСАЮЗЕ МОГУЦЬ ЗАБАРАНІЦЬ АДНАРАЗОВЫ ПОСУД З ПЛАСТЫКУ

Еўракамісія плануе забараніць шэраг аднаразовых прадуктаў з пластыку і фактычна штрафаваць краіны — члены Еўрасаюза за пластыкавае смецце, якое не падлягае другаснай перапрацоўцы. Пра гэта паведамілі выданні нямецкага мэдыяканцэрна Funke Mediengruppe.

Згодна з праектам дырэктывы, забарона павінна закрануць аднаразовыя вырабы з пластыку, альтэрнатыва якім лёгка даступная і прымальная па цане, тлумачаць СМІ.

Гаворка ідзе, у прыватнасці, пра аднаразовы посуд, сталовыя прыборы, трубачкі-саломінкі для напояў, ватныя палачкі і пластыкавыя мацаванні для паветраных шароў. Акрамя таго, планецца абмежаваць выкарыстанне пластыкавых упаковак для ежы, якую прадаюць навынас закусачныя.

### ЕГІПЦЯНІН ПАДАЎ ІСК ДА КАПІТАНА «РЭАЛА» НА МІЛЬЯРД ЕЎРА

Юрыст з Егіпта Басэм Вахба падаў у суд на капітана мадрыдскага футбольнага клуба «Рэал» Серхіа Рамаса за наўмыснае нанясенне траўмы форварду «Ліверпуля» Махамеду Салаху ў фінале Лігі чэмпіёнаў, паведамляе Goal.com. «Рамас наўмысна траўмаваў Салаха і павінен быць пакараны за свае дзеянні», — сказаў юрыст у эфіры егіпецкаму тэлеканалу.

Пасля фіналу Лігі чэмпіёнаў на Change.org з'явілася петыцыя з патрабаваннем пакараць Рамаса за нанесеную Салаху траўму. Яе зараз падпісалі больш за 387 тысяч чалавек.

### РАМАН АБРАМОВІЧ ІМІГРАВАЎ У ІЗРАІЛЬ І СТАЎ САМЫМ БАГАТЫМ ІЗРАІЛЬЦЯНІНАМ



Расійскі мільярдэр Раман Абрамовіч, уладальнік футбольнага клуба «Чэлсі», іміграваў у Ізраіль. Гэтую інфармацыю пацвердзілі ў ізраільскім міністэрстве ўнутраных спраў, перадае газета The Times Of Israel. Як удакладняе газета, ён стаў самым багатым ізраільцянінам.

Па даных выдання Israel Hayom, мільярдэр збіраецца жыць у фешэнебельным раёне Невэ-Цэдэк у Тэль-Авіве, дзе ў яго будуецца асабняк.

Forbes ацэньвае багацце Рамана Абрамовіча ў 11 млрд долараў.

■ На слыху

### Памёр пацярпелы ад выбуху

**Адзін з пацярпелых падчас выбуху ў адміністрацыйна-вытворчым будынку ў вёсцы Каралёў Стан пад Мінскам у канцы мінулага тыдня быў пераведзены з апёкавай рэанімацыі гарадской клінічнай бальніцы хуткай дапамогі сталіцы ў аддзяленне, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.**

Другі пацярпелы заставаўся ў рэанімацыі. І вось стала вядома, што ён памёр... Трэці пацярпелы, які атрымаў траўмы сярэдняй ступені цяжкасці, цяпер праходзіць лячэнне стацыянарна. Пацыент, які паступіў у бальніцу з траўмай лёгкай ступені, знаходзіцца на амбулаторным лячэнні. Падчас выбуху ў будынку па вытворчасці бітумнай гідраізаляцыі плошчай 2,4 тысячы квадратных метраў з наступным гарэннем пацярпелі чатыры чалавекі. Здарэнне адбылося ранкам 22 мая.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### Зачапіў вудай за провад

У Драгічынскім раёне мужчына загінуў пасля рыбалкі па дарозе ад вадаёма да сваёй машыны. Малады жыхар райцэнтра лавіў рыбу побач з вёскай Навасёлкі на абводным канале мясцовага рыбгаса. Увечары ён скончыў рыбную лоўлю і накіраваўся да аўтамабіля, які стаяў наводдаль. Пры гэтым рыбалоў-аматар вудзільна не склаў, а нёс яго ў руцэ. У нейкі момант чалавек спатыкнуўся аб штучны насып, зроблены работнікамі рыбгаса для папярэджання заезду аўтатранспарту, і зачапіў вудай провад электраперадачы. У выніку трапіў пад напружанне і атрымаў удар токам, які аказаўся смяротным.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# НА ПАРОЗЕ НОВАГА ЖЫЦЦЁВАГА ЭТАПУ

## У Акадэміі МУС адкрылі «Алею Памяці, Гонару, Славы»




**Май гэтага года стаў знакавым для галоўнай міліцэйскай ВНУ краіны. Сёлета споўнілася 60 гадоў з дня заснавання Акадэміі МУС. 16 мая 1958 года быў падпісаны ўказ аб стварэнні Мінскага аддзялення факультэта завочнага навучання вышэйшай школы МУС СССР. За мінулыя дзесяцігоддзі аддзяленне дарасло да звання самастойнай вышэйшай навучальнай установы, якая да таго ж з'яўляецца адной з найлепшых у краіне.**



На дадзены момант у структуры ВНУ дзейнічаюць 6 факультэтаў і 19 кафедраў, дзе навучаюць 180 дысцыплінам. На базе яе створаны Міжнародны навучальны цэнтр. Усяго з вышэйшай навучальнай установы выпусціліся больш за 30 тысяч уладальнікаў адукацыі ў сферы юрыспрудэнцыі. Пяць выпускнікоў акадэміі сталі міністрамі ўнутраных спраў Беларусі, сярод іх і дзейны міністр Ігар Шуневіч, а Адыльгерэй Магамедтагіраў узначаліў міліцэйскае ведамства ў Рэспубліцы Дагестан. Акрамя таго, ВНУ выпусціла больш за 40 будучых генералаў, кіраўнікоў розных падраздзяленняў МУС. Наогул у сценах акадэміі рыхтуюць не толькі супрацоўнікаў міліцыі, але і спецыялістаў для ўсіх ведамстваў, якія адказваюць за бяспеку дзяржавы і яе жыхароў.

Кульмінацыяй святкавання юбілею стала адкрыццё мемарыяла «Алея Памяці, Гонару, Славы», які размясціўся ва ўнутраным двары акадэміі. Ключавая фігура скульптурнай кампазіцыі — выпускнік гэтай навучальнай установы, адлюстраваны на парозе новага этапу свайго жыцця. Як сімвал гэтага — дыплом і лейтэнанцкія пагоны ў руках, але пакуль яшчэ курсанцкія — на плячах. Акрамя скульптуры алея складаецца з чатырох памятных камянёў, якія прысвечаны чатыром важным вехам у гісторыі беларускіх праваахоўных органаў. Першы з іх пастаўлены ў гонар супрацоўнікаў акадэміі, што прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне, усяго іх было 49 чалавек. Яго адкрыла ветэран вайны Тамара Заўгародняя, у мінулым — начальнік спецыяльнай бібліятэкі Мінскай вышэйшай школы МУС СССР (з 1995 года пачала насіць назву Акадэмія МУС). Другі камень усталяваны ў гонар супрацоўнікаў і выпускнікоў акадэміі, якія загінулі пры выкананні службовага абавязку. Таксама мемарыял закліканы ушанаваць памяць тых, хто прымаў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС і ў выкананні інтэрнацыянальнага абавязку. На цырымоніі прысутнічалі як выпускнікі акадэміі, што маюць непасрэднае дачыненне да гэтых трагічных падзей, так і блізкія тых, хто аддаў сваё жыццё дзеля агульнага дабра. Яднанне цяперашніх курсантаў і тых, хто пакінуў сцены акадэміі дзясяткі гадоў таму, стварыла асабліва кранальную атмасферу.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Гісторыя навучальнай установы — гэта перш за ўсё людзі з іх адданасцю сваёй справе. Асаблівы адзначу выкладчыцкі склад, які, паспяхова спалучаючы навуку з практыкай, дае будучым афіцэрам глыбокія прафесійныя веды, фарміруе ў іх пачуццё патрыятызму і адданасці абавязку. Менавіта таму годнымі прадаўжальнікамі традыцый акадэміі становяцца яе выпускнікі. Яны добрасумленна выконваюць свой прафесійны абавязак практычна ва ўсіх праваахоўных структурах нашай дзяржавы. Сярод іх — міністры і кіраўнікі падраздзяленняў, генералы і афіцэры, лаўрэаты дзяржаўных прэмій, заслужаныя дзеячы навукі і адукацыі, — адзначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў генерал-маёр міліцыі Аляксандр БАРСУКОЎ.**

Аб высокім узроўні падрыхтоўкі курсантаў сведчыць той факт, што з 1996 года 92 чалавекі станавіліся стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Якасць прафесійнай падрыхтоўкі выпускнікоў ВНУ пацвярджае і цеснае супрацоўніцтва з іншымі ўстановамі адукацыі па ўсім свеце. Так, павіншаваць акадэмію з юбілеем прыехалі больш за 20 замежных дэлегацый. Як расказаў журналістам прафесар Кітайскага ўніверсітэта крымінальнай паліцыі Чжаа Хэйвэй, ён шчыра ўражаны арганізацыяй навучальнага працэсу, а таксама тэхнічным аснашчэннем акадэміі. Таму далейшае супрацоўніцтва з беларускім бокам уяўляе вялікую цікавасць для Кітая.

— Мы думаем пра нашу будучыню, пра тое, хто стане на абарону правапарадку і законнасці ў краіне ўслед за намі. Упэўнены, што нашы выпускнікі і надалей з гонарам будуць выконваць ускладзеныя на іх задачы, забяспечваючы надзейную абарону законных правоў і інтарэсаў грамадзян ад злачынных замахаў, дэманструючы зламыснікам сілу Закону і перамогу справядлівасці, — падкрэсліў **начальнік Акадэміі МУС генерал-маёр міліцыі Уладзімір БАЧЫЛА** (на фота).

■ Ура, канікулы!

# ПАРА ВЕСЯЛОСЦІ... АЛЕ Ў РАМКАХ ЗАКАНАДАЎСТВА

**Сёння ў школах па ўсёй краіне пройдуць урачыстыя лінейкі ў гонар апошняга званка. Для ўсіх, акрамя выпускнікоў, гэта падстава з палёгкай выдыхнуць. А вось для бацькоў гэты час, наадварот, павінен стаць перыядам больш пільнай увагі за сваімі дзецьмі. Бо часта так бывае, што летам падлеткі на працягу ўсяго дня пакінутыя самі сабе. Пра тое, што трэба рабіць, каб засцерагчы сваіх дзяцей на час канікул як ад небяспечных здарэнняў, так і правапарушэнняў, мы пагаварылі з начальнікам арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнікам міліцыі Ігарам ГАТАЛЬСКІМ.**



## ВОРАГ НУМАР АДЗІН

Паводле статыстыкі, пачынаючы з 2014 года крыміногенная абстаноўка сярод падлеткаў паступова памяншаецца. Адзіным выключэннем стаў 2015 год, які быў адзначаны ўсплёскам ужывання забароненых рэчываў, аднак досыць хутка сітуацыю ўдалося стабілізаваць. Першыя чатыры месяцы гэтага года таксама паказалі зніжэнне колькасці злачынстваў, якія здзяйсняюць падлеткі, амаль на чвэрць. Аднак ёсць і негатыўныя моманты. На паводзіны падлеткаў можа падзейнічаць новы фільм або камп'ютарная гульня — юнакі вельмі хутка схопліваюць усе модныя тэндэнцыі, прычым часам, каб здавацца крутейшымі ў асяроддзі аднагодкаў, выбіраюць не самыя лепшыя прыклады для пераймання.

Сёння аўтамабілі часта становяцца сродкам здзяйснення правапарушэнняў. Адзін з прыкладаў — кіраванне без правоў. Што датычыцца аўтамабіля, то шлях да кіравання ім падлеткам у прынцыпе закрыты: як мы ўсе памятаем, правы можна атрымаць толькі пасля дасягнення 18 гадоў. А вось з мапедамі і матацыкламі такая магчымасць ёсць і раней, але абавязкова трэба ўлічваць нюансы. У любым выпадку садзіцца за руль можна толькі маючы прыдатную катэгорыю правоў. А ў ідэале — яшчэ і вопыт, бо падлеткі ў сілу свайго ўзросту нярэдка хочуць паказаць свае навыкі і бясстрашнасць, што можа прывесці да аварыйных сітуацый на дарозе. Часам такія думкі ім прыходзяць праз затуманеную свядомасць: кіраванне без правоў у нецвярозым стане — камбінацыя, якую інакш як страшэннай не назавеш.

Дарэчы, ёсць факты, калі падлеткаў затрымліваюць за ўжыванне алкагольных напояў, а таксама знаходжанне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення. Адказнасць за гэтыя ўчынкі надыходзіць з 16 гадоў, да наступлення гэтага ўзросту яна цалкам кладзецца на плечы бацькоў. Ёсць толькі шэраг выключэнняў, калі падлетак можа прыцягвацца да адказнасці ўжо з 14 гадоў. Самае непрыемнае, што злоўжыванне алкаголем часта цягне за сабой наступствы ў выглядзе боек, дробных крадзяжоў, пашкоджання маёмасці і гэтак далей — увогуле да ўсяго таго, што большасць у цвярозым стане нават не можа сабе ўявіць.

Лагічным пытаннем пры затрыманні падлетка ў нецвярозым выглядзе становіцца наступнае: дзе ён узяў алкаголь? Фармулёўкі «пачаставалі сябры» ці «папрасіў незнаёмца купіць у краме» могуць быць вельмі небяспечныя для тых самых «добразычліўцаў», бо ўцягванне непаўналетняга ў антыграмадскія паводзіны шляхам куплі для яго алкаголю або сумеснае ўжыванне спіртных напояў, моцнадзейных або адурманьваючых рэчываў цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь.

## ЛЕТНІЯ НОЧЫ ДОМА

Яшчэ адно правіла, якое дарослыя часта ігнаруюць, тое, што ў перыяд з 23 да 6 раніцы падлеткі, якія не дасягнулі 16 гадоў, не маюць права знаходзіцца адны на вуліцы. Іх павінны суправаджаць альбо бацькі, альбо іншыя дарослыя па іх даручэнні. А вось доступ ва ўсе начныя забаўляльныя ўстановы закрыты падлеткам аж да паўналецця.

Свая спецыфіка ёсць і ў сельскай мясцовасці. Тут непаўналетнія часта «трапляюцца» без святлоадбівальных элементаў у цёмны час сутак або пры пераходзе дарогі ў неналежным месцы.

Прадстаўнікі старэйшага пакалення часта скардзяцца, што дзяцей і падлеткаў немагчыма адправіць пагуляць на вуліцу. І гэта таксама накладае пэўны адбітак на склад правапарушэнняў. Значна больш за апошні час стала злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій, якія здзяйсняюць юныя хакеры. Менавіта таму супрацоўнікі міліцыі рэкамендуюць бацькам больш увагі ўдзяляць кантролю за тым, чым іх дзіця займаецца ў інтэрнэце.

## НАЙЛЕПШАЯ ПРАФІЛАКТЫКА

Каб знізіць агульную колькасць правапарушэнняў сярод падлеткаў, а таксама гарантаваць высокі ўзровень іх бяспекі ў летні перыяд, органы ўнутраных спраў сумесна з іншымі зацікаўленымі ведамствамі праводзяць актыўную прафілактычную работу. Так, да 5 чэрвеня працягнецца спецыяльны комплекс мерапрыемстваў «Увага — дзеці!», накіраваны на прадухіленне ДТЗ з удзелам непаўналетніх. Кіроўцам падчас правядзення СКМ нават днём рэкамендуецца рухацца з уключаным блізкім святлом фар.

Яшчэ адзін маштабны комплекс мерапрыемстваў — рэспубліканская міжведамасная праграма «Клопат», якая праходзіць у перыяд з 1 мая па 1 кастрычніка. Яе асноўная мэта — стварэнне спрыяльных умоў для развіцця і занятасці падлеткаў, каб у іх не ўзнікала думак аб учыненні супрацьпраўных дзеянняў.

**Юнакі вельмі хутка схопліваюць усе модныя тэндэнцыі, прычым часам, каб здавацца крутейшымі ў асяроддзі аднагодкаў, выбіраюць не самыя лепшыя прыклады для пераймання.**

Не застаюцца ў гэты перыяд без удзелу дзеці з сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, а таксама так званыя цяжкія падлеткі. Іх адмыслова накіроўваюць у лагеры спартыўнага і ваенна-патрыятычнага кірунку, многія з іх арганізаваны на базе воінскіх фарміраванняў, таксама распаўсюджаны і палатачныя гарадкі. Абавязковы распарадак дня — адзін з эфектыўных спосабаў прывіцця дысцыпліны. Што датычыцца дзіцячых аздараўленчых лагераў у прынцыпе, то ў кожным з іх на працягу ўсяго перыяду працы абавязкова знаходзіцца супрацоўнік унутраных спраў. Дарэчы, яшчэ адзін з важных напрамкаў акцыі — летняя занятасць. Падлеткі могуць далучыцца як да валанцёрскага, так і да працоўнага руху, тым самым атрымаўшы магчымасць легальным чынам зарабіць свае першыя грошы.

— Як толькі падлетак знаходзіць сабе занятак па душы, перастае пакутаваць ад гультайства, пры гэтым атрымліваючы досыць клопату і ўвагі ад сваёй сям'і, усе думкі аб супрацьпраўных дзеяннях проста знікаюць з яго галавы. Наша задача — сарыентаваць яго ў правільным кірунку, — падкрэсліў Ігар Гатальскі ■

■ Па-за службай

# ЗНАК ПАВАГІ ДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ

## Палкоўнік міліцыі паказвае сваю незвычайную калекцыю



**Гэтая рэч увайшла ва ўжытак не так даўно — усяго паўтара стагоддзя таму. Спачатку не прымалі, маўляў, як жа можна свае думкі і пачуцці выстаўляць напаказ. А крыху пазней палюбілі — за прыгажосць і невысокі кошт. А вось у галоўнага інспектара кантрольна-інспектарскага ўпраўлення штаба МУС Віталя БЫКАВА была іншая прычына захапіцца калекцыянаваннем гэтых прадметаў — захаваць і сістэматызаваць гістарычныя даныя аб сваёй малой Радзіме. Вы ўжо здагадаліся аб чым ідзе гаворка? Сапраўды, галоўная тэма нашага матэрыялу — яе вялікасць паштоўка!**

### Стагадовая фотапаштоўка з асабістым подпісам аўтара

Калекцыянаваннем Віталь Мікалаевіч захапляецца з дзяцінства, пачыналася ўсё з марак і мадэляў аўтамабіляў. Па меры сталення запал да пошуку новых асобнікаў не аслабеў, а толькі ўмацаваўся: мужчына зразумеў, што гэта хобі застанецца з ім на ўсё жыццё. Адзін з кірункаў — паштоўкі. Маючы досыць вялікі вопыт у гэтай справе, Віталь Мікалаевіч вырашыў займацца ёй не толькі дзеля задавальнення, але і дзеля глыбокага вывучэння пытання. Тэматыку абраў па душы — паштоўкі з выявай Ліды. Гэта горад, дзе прайшло яго юнацтва і дзе зараз яго чакае гасцінны бацькоўскі дом.

Расказваць пра паштоўкі палкоўнік міліцыі пачынае з гістарычнай даведкі. Першы у свеце асобнік быў прададзены ў Аўстрыі ў 1869 годзе. А вось у Расійскай імперыі, да якой тады адносілася тэрыторыя Беларусі, іх пачалі выраблясць на некалькі дзесяцігоддзяў пазней — у 1894-м. Выявы розных гарадоў былі адным з самых распаўсюджаных сюжэтаў, якія друкавалі на паштоўках. У гэтым быў пэўны сэнс: часта паштоўкі выкарыстоўвалі, каб перадаць прывітанне з таго ці іншага месца. Праўда, паштоўка з выявай Ліды яшчэ не пацвярджае той факт, што чалавек пабываў у самім горадзе. Картку можна было купіць на вакзале падчас прыпынку цягніка, а адправіць ужо зусім з іншага населенага пункта.

Найстарэйшая паштоўка з выявай роднага горада ў калекцыі Віталя Мікалаевіча датуецца самым пачаткам XX стагоддзя. Саму калекцыю можна падзяліць на тры асноўныя перыяды: гады Расійскай імперыі, германская акупацыя ў перыяд Першай сусветнай і час, калі Ліда ўваходзіла ў склад Польшчы — да 1939 года. Больш за ўсё паштовак прыпадае на перыяд нямецкай акупацыі. Хоць ён і доўжыўся ўсяго некалькі гадоў, з 1915-га па 1918-ы, тады быў сапраўдны бум захаплення фатаграфіяй, таму паштовак з рознымі здымкамі выпускалі вельмі шмат.



Паўсядзённае жыццё было распаўсюджаным матывам для фотаздымкаў.

Усяго ж, як расказвае палкоўнік міліцыі, яму вядома каля 500 паштовак з выявай Ліды. Віталю Мікалаевічу ўжо ўдалося сабраць больш за 300 з іх. Разглядаючы альбомы, абывацель можа падумаць, што паштоўкі дублююцца, таму што не тое што здымкі зроблены з аднаго ракурсу, а нават выявы паўтараюцца, і не раз. Але для сапраўднага калекцыянера — гэта не паказчык. Паглядзеўшы на прыватныя вытворцы паштовак.

А вось будзе паштоўка чыстай або спісанай спорным почыркам, на яе коштоўнасць не ўплывае. Даволі шмат асобнікаў на нямецкай мове, таму разабраца ў сутнасці паслання не так проста. Але трыманне ў руках рэчы, якая мае не толькі гістарычную, але і для кагосьці асабістую значнасць, выклікае асаблівае трапятанне.

### Ад замка да прадаўцоў венікаў

— Калекцыянер адрозніваецца ад збіральніка тым, што ён шукае асобнікі, каб даведацца нешта новае, а не дзеля самога факта назапашвання. Так і мне многае ўдалося даведацца пра гісторыю свайго горада. На жаль, у гады Вялікай Айчыннай вайны Ліда была практычна цалкам разбурана, таму зараз у ёй можна знайсці лічаныя будынкі з тых паштовак, — расказвае Віталь Мікалаевіч.

Прыклад такога будынка — візітная картка горада — Лідскі замак. Мабыць, гэта адзін з нямногіх выпадкаў, калі гады ідуць збудаванню на карысць. Бо ў пачатку XX стагоддзя на месцы замка быў усяго толькі кавалак адной са сцен, які, тым не менш, не раз захоўвалі на паштоўках. Яшчэ адзін будынак, які захаваўся, на шчасце, цалкам — цяпер дзейны касцёл Узвышэння Святога Крыжа. Калі параўноўваць паштоўкі з сучасным выглядам, можна знайсці ўсяго адно істотнае адрозненне: у 1970-я вакол яго прыбралі плот. Таксама цяпер у горадзе можна ўбачыць і былы касцёл піяраў — зараз царква Архістраціга Міхаіла, якая адзін час працавала як планетарый. Акрамя гэтага, стагадовы рубеж у Лідзе перайшло ўсяго некалькі дамоў, адзін з іх, пабудаваны ў 1812 годзе, належаў купцу Гурэвічу. Дарэчы, непарушанымі засталіся і ДАСы — дамы афіцэрскага складу. Іх пабудавалі ў 1908 годзе з цэглы, якая засталася ад манастыра кармелітак. У іх, у Паўночным гарадку, да гэтага часу жывуць сем'і лідчан.



Будынак Лідскага вакзала. Быў зруйнаваны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Але часцей за ўсё сустракаюцца паштоўкі не з гэтымі знакавымі аб'ектамі, а з выявай галоўнай вуліцы горада, якая ў розныя гады насіла назву Віленскай, Сувальскай, а цяпер — Савецкай. Таксама традыцыйна часта фатаграфавалі пошту і вакзал. Лідскі, на жаль, не захаваўся, ён быў адбудаваны ўжо пасля вайны. Аднак на старых паштоўках яго часта блытаюць з маладзечанскім — дызайн практычна ідэнтычны.

Самыя любімыя сюжэты Віталя Мікалаевіча — тыя, дзе адлюстравана штодзённае жыццё простых людзей. Прадаўцы венікаў на рынку, ваданосы, дзеці, якія гуляюць на вуліцы... Сустракаліся і больш суровыя карцінкі: пажар і нават пахаванне карміцеля. Наогул, стаўленне да сюжэтаў, ды і надпісаў, раней было больш простым. У калекцыі ёсць паштоўка з выявай лідскага касцёла, які падпісалі як віленскі. Або з замкавай сцяной, на якой час пабудовы абазначаны як VIII стагоддзе, хоць узводзіць крэпасць пачалі ў XIV. Ёсць і больш істотныя памылкі. Так, нямецкія вытворцы друкавалі паштоўкі з парадам расійскіх царскіх войскаў замест сваіх — узялі старыя негатывы.

### Рэдкія знаходкі

— Сапраўднае шчасце даследчыка, калі ўдаецца знайсці паштоўку, якую ты яшчэ не сустракаў. Аднойчы я спачатку набыў паштоўку, а потым толькі дакладна вызначыў, што гэта Ліда — параўнаў з іншымі ўзорамі. Але цяпер мне засталося сабраць толькі самыя рэдкія, таму папоўніць калекцыю новым асобнікам атрымліваецца не часцей, чым раз на некалькі месяцаў. Больш за ўсё з гэтым дапамагаюць клубы калекцыянераў. Праўда, тых, хто займаецца менавіта Лідай, не так многа, асабіста мне знаемыя тры такія аматары, — расказвае палкоўнік міліцыі.



Выявы Ліды, якія часцей за ўсё друкавалі на паштоўках.

Мара Віталя Мікалаевіча — у перспектыве скласці каталог усіх паштовак, звязаных з Лідай, таму што пакуль паўнавартаснага даследчага матэрыялу па гэтай тэме няма. Не прапускае магчымасць калекцыянер набыць і пазнейшыя паштоўкі з выявай любімага горада, але адносіць іх ужо да асобнай часткі збору. Тым больш што яны істотна адрозніваюцца адна ад адной: пасля 1939 года аж да 1960-х паштоўкі з гарадамі практычна не выпускаліся.

Як прызнаецца палкоўнік міліцыі, у хобі, якое патрабуе скрупулёзнасці і вялікай канцэнтрацыі ўвагі, прафесія толькі дапамагае. Тым больш што ў органах унутраных спраў ён працуе ўжо больш за 26 гадоў.

— Дысцыпліна выхоўвае любоў да парадку ў шырокім сэнсе гэтага слова. Думаю, без гэтай якасці мне не ўдалося б сабраць і дзясятай часткі калекцыі. Ну і вядома, неабходны аналітычны склад розуму, каб калекцыянаванне не ператварылася ў збіральніцтва, — адзначае Віталь Быкаў. ■

## Віншуем!

Падведзены вынікі конкурсу на самае лепшае асвятленне дзейнасці Міністэрства ўнутраных спраў у СМІ. Пераможцам у намінацыі «Найлепшы аўтар» стала спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» Дар'я Каско. Найлепшым праектам была прызнана праграма «Цяжкі панядзелак» дырэкцыі радыё тэлерадыёкампаніі «Магілёў», а найлепшым праектам да 100-годдзя беларускай міліцыі стала работа тэлерадыёкампаніі «Брэст» — тэматычны відэафільм «100-годдзю міліцыі Беларусі прысвячаецца» і іншыя. Лаўрэатаў конкурсу выбралі ў 10 намінацыях, усяго ж на суд журы была прадстаўлена 171 работа творчых калектываў і асобных аўтараў.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я КАСКО.**

■ На скрыжаванні думак

# «ДРУГАЯ НАВІГАЦЫЯ»,

## або Як дасягнуць запаветнага берага ва ўмовах духоўнага крызісу?



Фота Надзеі БУЖАН.

**Сучаснае грамадства жыве ў рэжыме падзей, якія ствараюць магутнае інфармацыйнае поле. Яны замяняюць нам сэнс. Атрымліваецца, што мы, як той кіроўца, які едзе на вялікай хуткасці і не паспявае асэнсоўваць усё, што адбываецца вакол яго, а рэагуе толькі на сітуацыі, што ўзнікаюць непасрэдна перад ім на дарозе... Адсюль — пытанне: каго павінны рыхтаваць нашы ўніверсітэты? Добрых спецыялістаў, вузкіх прафесіяналаў ці асоб з маральным стрыжнем? Якія фактары ўвогуле ўплываюць на фарміраванне ў маладога пакалення духоўных арыенціраў? Як нараджаюцца дэструктыўныя ідэі, ідэалы і мадэлі паводзін? Пра ўсё гэта разважалі ўдзельнікі круглага стала «ІТ-краіна: маральнасць асобы ў інфармацыйным грамадстве», які прайшоў у сценах БДУІР па ініцыятыве Савета маладых вучоных універсітэта. Яго мэтай было стварыць пастаянную дыскусійную пляцоўку па праблеме дэгуманізацыі стасункаў і раз'яднанасці людзей у інфармацыйным грамадстве. Да размовы былі запрошаны прадстаўнікі тэхнічных універсітэтаў, БДУ, Інстытута тэалогіі, Міністэрства адукацыі, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і Беларускай праваслаўнай царквы.**

### Дапамогуць сацыяльныя фільтры

— Віртуальны свет настолькі пашырае граніцы ўяўных магчымасцяў, што яны пачынаюць ужо межаваць з усёдазволенасцю. Не дзіўна, што асабліва прывабны гэты свет для маладых людзей: ён захоплівае іх настолькі, што набывае форму хваравітай залежнасці. Прычым размова ідзе ўжо не проста пра бескарыснасць віртуальных забаў, а пра пагрозу — духоўную, фізічную і нават псіхічную, — папярэджвае **епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі ВЕНІЯМІН.** — Каб разабрацца, чаго больш у інфакамунікацыйных тэхналогіях — шкоды ці карысці — трэба падысці да гэтай праблемы са светапоглядных пазіцый. Дзякуючы інтэрнэту людзі хутчэй адгукаюцца на заклікі пра дапамогу, хутчэй распаўсюджваецца сацыяльна важная інфармацыя. Ёсць пастаянны доступ і да царкоўных інфармацыйных рэсурсаў.

**«Кодэкс — не абломак патанулага карабля, а маяк на жыццёвым шляху. Яго задача — быць маральным арыенцірам».**

Камп'ютары дапамагаюць і ў вучобе, і ў засваенні прафесій, і ў рабоце. Аднак і там, і там патрабуюцца якасці, якія не набываюцца з дапамогай тэхналогій, напрыклад цярплівасць, мэтанакіраванасць, павага і любоў да бліжняга, гатоўнасць прыйсці на дапамогу. Несумненна, што светапогляд людзей змяняецца ў канкрэтныя гістарычныя эпохі. Характэрнай рысай інфармацыйнай эпохі з'яўляецца імклівае распаўсюджванне інфармацыі, якая ўплывае на эканамічную, палітычную і сацыяльна-культурную сітуацыю як у асобна ўзятым рэгіёне, так і ў свеце. Для абазначэння новага тыпу светапогляду з'явіўся тэрмін «інфармацыйны»: яго адметныя рысы — уключанасць у інфармацыйнае асяроддзе, сітуацыйнасць атрымання інфармацыі і пасіўнасць яе спажывання. Чалавек аказваецца не ў рэальным свеце, а ў свеце інфармацыі пра рэальны свет. У такіх умовах усё большую актуальнасць набывае крытычнае стаўленне не толькі да спажывання, але і да пошуку інфармацыі. У інфармацыйным грамадстве чалавек перагружаецца інфармацыяй, стамляецца ад патоку навін, прыгнятаецца навязлівай рэкламай.

Адчуваючы адзіноту, юнакі і дзяўчаты шукаюць стасункаў у сацыяльных сетках, дзе ўсе кантакты зводзяцца да перасылкі тэкставых паведамленняў, часта на штучным слэнгу, а эмоцыі прысутнічаюць толькі ў выглядзе смайлікаў. Сёння мы назіраем імкненне людзей пераўтварыць свет і падагнаць яго пад сябе. Гэтым займаецца пакаленне Z.

У інфармацыйную эпоху маральныя арыенціры сталі размытыя, невыразныя і неабавязковыя. Між іншым, у любую гістарычную эпоху з любым узроўнем тэхнічнага развіцця чалавек застаецца тым жа самым — з усімі сваімі слабасцямі, сумненнямі і надзеямі.

«Ці парушае маральныя нормы гулец, які ў камп'ютарнай гульні забівае віртуальных ворагаў і захоплівае чужую маёмасць? Ці той, хто ананімна распаўсюджвае непраўдзівую інфармацыю? — задае зусім не рытарычнае пытанне праасвяшчэнны Веніямін. — Усё адбываецца быццам бы ў віртуальным свеце... Я лічу, што ён парушае не толькі хрысціянскія запаведзі, але і базавыя этычныя нормы. Паступова жыццё запаўняецца гульнёй, пераўтвараецца ў гульню... Развіццё інфармацыйных тэхналогій нацэлена на тое, каб зрабіць жыццё чалавека больш лёгкім, гарманічным, цікавым, але ў сеціве побач можа знаходзіцца як пазітыўная інфармацыя, якая нясе станоўчыя эмоцыі, так і інфармацыя, якая наносіць шкоду. Сацыяльнае зло імкнецца сябе рэкламаваць, выстаўляць напаказ...»

На думку прадстаўніка Царквы, актуальнай задачай становіцца развіццё сродкаў бяспекі інфармацыйнай культуры. «Сацыяльныя праграмныя фільтры змаглі б засцерагчы карыстальнікаў ад уздзеяння шкодных вірусаў, як абараняюць тэхніку розныя антывірусныя праграмы, — падкрэслівае ён. — Хрысціянскі светапогляд можа паслужыць надзейнай апорай у сцвярджэнні такіх каштоўнасцяў, якія б садзейнічалі выхаванню імунітэту да разбуральнага ўплыву ўсёдазволенасці ў інфармацыйнай прасторы».

### Страчанае пакаленне?

— Пошук новых формаў маральнага рэгулявання з'яўляецца ўмовай выжывання сучаснай цывілізацыі, — упэўнена **загадчык кафедры філасофіі БДУІР, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Галіна МАЛЫХІНА.** — Гэта задача ў сучасным свеце ўскладаецца ў першую чаргу на нацыянальныя сістэмы адукацыі, якія знаходзяцца ў прамой залежнасці ад стану і запытаў эканомікі, палітычных і культурных арыентацый, узроўню тэхналогій і сацыяльных чаканняў. Універсітэт абавязаны клапаціцца аб падрыхтоўцы «шматмерных» спецыялістаў з фундаментальнай і сістэматычнай адукацыяй, закладваць трывалы падмурак не толькі для будучай прафесійнай дзейнасці, але і фарміраваць светапогляд, ствараць сістэму каштоўнасцяў. Інакш кажучы, навучанне студэнтаў ва ўніверсітэце не павінна зводзіцца да вузкапрафесійнай адукацыі. Для таго каб стаць годным грамадзянінам сваёй краіны, адных тэарэтычных ведаў недастаткова. «Каб жыць мудра, аднаго розуму мала» — казаў Фёдар Дастаеўскі. Важна, каб веды злучаліся з вопытам, традыцыямі, культурай свайго народа і пераўтвараліся ў перакананні, фарміравалі пэўны сацыяльны ідэал.



**«Размова ідзе ўжо не проста пра бескарыснасць віртуальных забаў, а пра пагрозу — духоўную, фізічную і нават псіхічную».**

Наколькі вышэйшая школа з гэтымі задачамі спраўляецца, асабліва ва ўмовах яе масавасці і скарачэння гадзін на гуманітарны блок? Наконт гэтага выказваліся розныя меркаванні. Прывядзём іх тэзісна.

«Мы не можам даць падрастаючаму пакаленню тое, чаго няма ў нас саміх. Калі мы кажам пра ролю асобы ў выхаванні, то ў першую чаргу павінны казаць пра асобу выкладчыка. На жаль, наяўнасць высокіх навуковых ступеняў яшчэ не гарантуе выхаваўчы патэнцыял».

«Існуе праблема разрыву пакаленняў. Першакурснікі настолькі хутка змяняюцца, што вопыт, набыты за год работы з імі, на наступны аказваецца ўжо бескарысным. Мы іх увесь час даганяем... Выкладчыкі глядзяць на студэнтаў, абапіраючыся на свой светапогляд і традыцыйныя каштоўнасці, адсюль і непаразуменне. Трэба прымаць моладзь такой, якая яна ёсць, і не навешваць ярлыкі кшталту «страчанае пакаленне»: маладыя людзі — плод грамадства, якое мы для іх стварылі, мы самі выбілі ў іх табурэтку ў дзяцінстве!»

«Дзе, як не ў вышэйшай школе, чытаць кнігі па паліталогіі, філасофіі, вучыцца незалежнасці ў сваіх меркаваннях, у тым ліку і па палітычных пытаннях? Гэта задача вышэйшай адукацыі — выхаваць асобу, здольную да крытычнага аналізу. Але на якіх прадметах навыкі такога аналізу выхоўваць, калі ахвяруюць гуманітарнымі дысцыплінамі?»

### Маяк на жыццёвым шляху

Між іншым, у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі яшчэ восем гадоў таму **быў прыняты «Маральны кодэкс выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў», які ўстанаўлівае прыярытэты ва ўзаемаадносінах ва ўніверсітэцкай супольнасці.** Сярод іх, напрыклад, **прафесіяналізм** (кампетэнтнасць, інавацыйны і творчы падыход да справы, ініцыятыўнасць, настойлівасць у дасягненні пастаўленых мэт, працавітасць, дысцыплінаванасць), **высокая маральная культура** (патрабавальнасць да сябе, ветлівасць, карэктнасць, сумленнасць і праўдзівасць, справядлівасць, добразычлівасць, самакрытычнасць, сціпласць), **грамадзянская сталасць.**

Важны пункт — акадэмічныя прыярытэты: **выкананне прынцыпаў навуковай этыкі,** недапушчальнасць выкарыстання ідэй, матэрыялаў і вынікаў работы іншых аўтараў без спасылкі на крыніцу, акадэмічная добрасумленнасць — як для тых, хто выкладае, так і для тых, хто здае экзамены.

Члены ўніверсітэцкай супольнасці павінны клапаціцца пра захаванне культуры мовы, атмасферы даверу і ўзаемнай павагі, не дапускаць канфліктных сітуацый у калектыве.

**Чалавек аказваецца не ў рэальным свеце, а ў свеце інфармацыі пра рэальны свет.**

— Калі толькі ўзнікла ідэя стварэння маральнага кодэкса, студэнты адразу запыталіся, ці будзе ён распаўсюджвацца на выкладчыкаў? Гэта была справядлівая заўвага, — падзялілася сваім меркаваннем Галіна Малыхіна. — Але прыняцце ўніверсітэцкай супольнасцю кодэкса яшчэ не азначае, што ўсе маральныя праблемы вырашыліся і больш нічога рабіць не трэба. Сам факт урачыстага прыняцця Маральнага кодэкса — падзея, безумоўна, знакавая. Аднак гэта не канец, а пачатак шляху. Кодэкс — не абломак патанулага карабля, а маяк на жыццёвым шляху. Яго задача — быць маральным арыенцірам у працэсе маральнага самаразвіцця.

У Старажытнай Грэцыі пераход паруснага судна на кіраванне з дапамогай вёслаў, калі заціхаў вецер і наступаў штыль, называўся, па вобразным выразе Платона, «другой навігацыяй». У такім выпадку даводзілася разлічваць ужо не на спадарожны вецер, а на ўласныя сілы. Гэты вобраз сімвалізуе не толькі пераход да іншага тыпу кіравання суднам, але і іншую ацэнку ролі кожнага члена каманды ў поспеху навігацыі.

Калі ўявіць сабе, што ўніверсітэт — гэта карабель, члены калектыву — весляры, а мэтай плавання з'яўляецца выхаванне высокамаральнай асобы, то вёсламі будуць каштоўнасныя прыярытэты маральнага кодэкса, на якія налягае каманда, каб сваімі сіламі дасягнуць запаветнага берага ва ўмовах штылю (духоўнага крызісу). Мы ўсе — у адной лодцы. І поспех нашай «другой навігацыі» будзе залежаць ад зладжаных, кааператыўных намаганняў усіх удзельнікаў плавання: і выкладчыкаў, і студэнтаў. Але «веславаць» прыйдзецца ўсім!

Па выніках круглага стала было прынята рашэнне праводзіць яго на базе БДУІР штогод, надаўшы яму статус рэспубліканскага міжвузаўскага мерапрыемства. Яшчэ адзін цікавы пункт рэзалюцыі — правесці конкурс сярод студэнтаў БДУІР па распрацоўцы праграмнага забеспячэння «Антымат» для смартфонаў і персанальных камп'ютараў. Яно дазволіць карыстальнікам абараніць сябе ад ненарматыўнай лексікі ў сацсетках і месенджарах. Для студэнтаў на рэгулярнай аснове будуць арганізоўвацца сустрэчы са спецыялістамі, якія займаюцца даследаваннямі сацыяльна-псіхалагічных аспектаў інфармацыйнай бяспекі. А сучасныя тэндэнцыі развіцця навукі і тэхнікі, іх маральны аспект прапанавана абмяркоўваць падчас адкрытых лекцый па навукова-папулярнай тэматыцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Пасля пісьма

# ДЖЭНТЛЬМЕН У ПАНСКІХ ШТАНАХ

**З Баранавіч па электроннай пошце прыйшоў ліст, у якім спецыяліст па сувязях з грамадскасцю адной з прыватных фірмаў расказвае, што вандалы псуюць іх дарагую вонкавую рэкламу, і ў кампаніі ёсць падазрэнне, што робяць гэта куды слабейшыя канкурэнты. Аўтары ліста не просяць знайсці ды пакараць нахабнікаў (аб гэтым яны ўжо папрасілі міліцыю), а прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы. Прыцягваю.**

Знаёмая сітуацыя, праўда: калі ў мяне карова здохла, то няхай і суседава не раздражняе сваёй задаволенай мордай ды поўным вымем.

Але гэта ўжо крайняя форма выражэння зайздрасці. А колькі навокал дробных, спадцішка зробленых прыкрасцяў! Напэўна, і ў сябе заўважалі: ноччу нехта каля самага пад'езда выставіў склад бытавых адходаў, хоць гэта рабіць забаронена. Альбо гаспадар шыкоўнага катэджа вывез цэлы прычэп будаўнічага смецця ў бліжні лес. Зрабіў, вядома, не ад недахопу грошай на законнае ўпарадкаванне адходаў, а проста самому так лепей, а што некаму горш, яго не хвалюе.

Скажаце, не з гэтай оперы? З гэтай, бо тыя ж «грамадзяне» з кватэр і катэджаў (дзе ж узяць іншых?) прыходзяць у бізнес і дзейнічаюць аналагічна.

Як вядома, канкурэнта трэба перамагаць у сумленнай барацьбе, калі ты гатовы дзейнічаць па законе і агульначалавечых правілах. Але як сказаў адзін гумарыст: калі джэнтльмен не можа выйграць па правілах, джэнтльмен мяняе правілы. Так і тут: не атрымліваецца перацягнуць кліентаў, дык хоць душу пацешыць, чужыя рэкламныя банеры патрушчыць. Потым пайдзі дакажы, бо не злавілі за руку, значыць, доказаў няма. Сумленне ж мучыць не будзе, бо гэта катэгорыя не для тых джэнтльменаў, пра якіх некалі ў вёсках казалі, што ў іх з панскіх штаноў хамская с...а тырчыць.

Як лічыць вядомы рэжысёр, дарэчы, выхадзец з Баранавіч, Сяргей Лазніца, вырашыць праблему могуць толькі выхаванне, адукацыя: дрэнна, маўляў, што цяперашнія людзі класіку не чытаюць. Праўда, сказаў ён гэта ў іншым кантэксце, пра іншых людзей. Але і сюды названы рэцэпт падыходзіць. Шкада толькі, што на гэтыя працэсы патрэбна надзвычай шмат часу, можа, нават не адно пакаленне вырасце, пакуль людзі навучацца не ламаць і пэцкаць вакол сябе, а жыць па-людску.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Урокі

# Ёсць такая прафесія

**Я працую ў школе настаўнікам пачатковых класаў і, апроч таго, выкладаю АБЖ (Асновы бяспекі жыццядзейнасці). Нядаўна мы з вучнямі праходзілі тэму «Прафесія — ратавальнік». І на ўроку я расказаў пра канкрэтнае здарэнне, удзельнікам якога давялося быць.**

А было так. Сёлета перад Радаўніцай мы з сям'ёй прыехалі на бацькаўшчыну маёй жонкі, у вёску Вязьма. Гэта адзін з самых прыгожых куточкаў нашага раёна, бо там зліваюцца рэкі Грэза і Друць. Мы з сынам схадзілі туды, палюбаваліся, пагулялі ў розныя гульні, наладзілі пікнік, а нарэшце — дужа цёплы быў вечар — проста сядзелі на лаўцы.

Раптам гэтую ідылію парушыў трэск, падобны на той, што пры награванні выдае шыфер... Значыць, нешта гарыць?

Схапіўшы вёдры, я выскачыў на вуліцу. Тое ж, як я заўважыў, зрабілі і іншыя вяскоўцы...

Калі прыбеглі на месца, убачылі, што гарыць летняя кухня, а людзей унутры няма.

Перш-наперш выклікалі пажарных. Потым трэба было «адсекчы» агонь ад суседніх будынкаў. Тут узнікла праблема, і заключалася яна ў тым, што над бліжняй студняй узвышаўся рэдкі па сённяшнім часе журавель. Вядро з яго дапамогай хутка не апусціш...

Але ж спачатку мы паламалі агароджу, каб забяспечыць доступ да пабудоў, ды сталі абліваць іх вадой. У гэтай мітусні я паспеў заўважыць, што ніхто з людзей не думаў пра сябе — пра тое ж парванае ці спэцканае адзенне, брудныя твары, згубленыя (потым дазнаўся) акуляры. Усе, як маглі, стараліся тушыць агонь, каб ён не перакінуўся далей.

На шчасце, праз некалькі хвілін мы пачулі гук сірэны і галасы: «Едуць!». Так, гэта былі пажарныя. Яны ўдакладнілі, ці няма каго ў палаючым будынку, і па камандзе «працуем!» прыступілі да сваіх абавязкаў... Літаральна праз некалькі хвілін пажар быў патушаны, мы разыходзіліся па дамах, з удзячнасцю згадваючы нашых ратавальнікаў, адчуваючы, што як быццам і самі парадніліся, сталі бліжэй адно да аднаго.

...Вось такія ўрокі падносіць жыццё, вучыць нас дзейнічаць. І, дай бог, правільна!

**Анатоль АСКІРКА,**
*г. Быхаў*

■ Даты

# СПОВЕДЗІ, САБРАНЫЯ РАЗАМ

**На 20 мовах свету выдадзены кнігі нашай першай Нобелеўскай лаўрэаткі Святланы Алексіевіч. Жанр іх — літаратурна-дакументальная аналітыка. І ўражанні ад яе вельмі моцныя, бо гэта — рэальныя споведзі рэальных людзей. Сабраныя разам пад вокладкамі «Апошнія сведкі», «У вайны — не жаночае аблічча», «Цынкавыя хлопчыкі», «Зачараваныя смерцю», «Чарнобыльская малітва», «Час сэканд-хэнд», яны зліваюцца ў агульнае шматгалоссе: з асобных «маленькіх» гісторый складаецца агульная карціна часу.**

Пісьменніца не раз наведвала наш горад, раён, сустракалася тут з людзьмі, запісвала ўспаміны ўдзельніц Другой сусветнай. Споведзі пяці нашых зямлячак трапілі, у прыватнасці, у кнігу «У вайны — не жаночае аблічча». У хуткім часе пасля яе выхаду адбылася прэзентацыя, сустрэча з мясцовай інтэлігенцыяй, пасля чаго кнігалюбы сталі з яшчэ большай цікавасцю сачыць за творчасцю Алексіевіч, пытаецца ў бібліятэках пра яе новыя творы.

Выбраныя старонкі з іх не раз агучваў і наш бібліятэчны выязны тэатр. Яго выступленні з нязменнай цікавасцю ўспрымаліся і ў вучнёўскім класе, і ў швейным цэху, і на пасяджэннях грамадскіх таварыстваў... Сімбіёз літаратуры і мастацтва дазваляў гледачам па-новаму — праз прызму сцэнічнага майстэрства — успрымаць прозу Святланы Алексіевіч, а імправізаваныя маналогі (уступны «Я паведу вас дарогай успамінаў» і заключны «Я не спавядальнік, не лекар, не суддзя, я такі ж чалавек, як і вы») дазволілі перадаць творчае крэда.

Сёлетні май для знакамітай пісьменніцы юбілейны. Для яе чытачоў — гэта яшчэ адна нагода, каб звярнуцца да творчасці.

**Тамара КРУТАЛЕВІЧ,**
*г. Беразіно*

■ Па-звяздоўску

# СПЯВАЙ, ДУША!

**Кажуць, аднойчы, выбіраючы сукенку для французскай каралевы, швачка дастала нейкую, мякка кажучы, стараватую... Але ж трохі паднавіла яе і прапанавала надзець. Марыя Антуанета з радасцю згадзілася... З той пары і пайшло гуляць, што ўсё новае — гэта добра забытае старое.**
**Такім чынам, на старонках «Звязды» зноў прыпеўкі. Чытайце і, вядома ж, спявайце, бо гэта (навукова даказана!) — змяншае пачуццё трывогі, дапамагае адольваць цяжкасці, а папросту — жыць.**

*Ёсць у продажы памада —*
*Запрацуе, што прынада:*
*Так бяруцца мужыкі —*
*Не патрэбны і кручкі!*

*Калі дзеўку*
*дзе ўшчыпнуць,*
*У Еўропе штраф дадуць.*
*Нам — няма чаго баяцца,*
*Можна добра патрымацца.*

*Дзед у ложак завалок —*
*І адразу звіўся...*
*Ведаў справу на зубок,*
*Ды «зубок» знасіўся.*

*— Мой каханы —*
*трактарыст,*
*Цэлы дзень у полі.*
*Добра, што не баяніст —*
*Піў бы ў застоллях!*

*Гэта ж трэба —два жаўткі*
*У адным яечку!*
*Мела курачка грахі*
*У сваім сардэчку.*

*Кажуць, сала не ўжывай —*
*Тлушч на ягадзіцах.*
*Таму й пенсію трымай:*
*На хлябок з вадзіцай.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Іван Адамавіч САЛАНОВІЧ з вёскі Любонічы Кіраўскага раёна напісаў, а калі дакладней сказаць «адшукаў», на гармоніку музыку да верша пра сваю малую радзіму. Фальклорны ансамбль «Спадчына», якім кіруе яго жонка Марыя Іванаўна *(на фота)*, гэтую песню спявае. А салірууюць у гурце яны — Іван і Марыя Салановічы.

*Тройчы есці за сталом?*
*Хопіць з нас і разу:*
*Толькі гэтак зберажом*
*Шмат вады і газу!*

*Каб здароўе не прапала,*
*Не купляйце, людзі, сала:*
*Дабаўляйце сабе ў піцу*
*Лебяду, асот, макрыцу...*

*Лес навокалчэзне-чахне —*
*Не адчуеш лета,*
*Нават мёд ужо не пахне,*
*Бо з «цукровых» кветак.*

**Мікола КУТАС,**
*в. Ілья, Вілейскі раён*

■ Памяць

# САМ ДЛЯ СЯБЕ

**...У шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя арганізацый па аказанні рытуальных паслуг і ў гарадах было няшмат. А да вёсак і наогул яны не даязджалі. Відаць, таму мой дзед Міколік загадзя нарыхтаваў дэфіцытных дошак, злажыў іх на гарышча, а побач прымасціў абчэсаныя бярвенца. На гэтыя будаўнічыя матэрыялы я калі-нікалі сядаў, каб у свой агульны сшытак запісваць юначыя вершы.**

Чаго «чакалі» гэтыя дошкі, я даведаўся, калі сабраўся ў войска. Дзядуля (яму было пад дзевяноста, хоць выглядаў ён значна маладзей, бо піў хіба пакрысе і не курыў ніколі) тады сказаў, што, можа, не дачакаецца, не дажыве да таго часу, калі я вярнуся. То, маўляў, май на ўвазе...

Служыў я і сапраўды доўга: чатыры гады на караблях Чарнаморскага флоту... Але дзед сустрэў мяне, прычым — на сваіх нагах. Праз нейкі час я зазірнуў на гарышча, дошак там ужо не было, затое стаяла гатовая дамавіна, у якой ляжалі розныя непатрэбныя рэчы. Я пазней даведаўся, што пустой яна і не павінна быць — дрэнная прыкмета...

Калі дзеда не стала, мы з сябруком унеслі труну ў хату. Цеслярам заставалася зрабіць толькі крыж, далакопам — выкапаць магілу на вясковых могілках: дзед загадзя паказаў, дзе яго пахаваць.

Мы ўсё зрабілі, як ён сказаў, бо дзядуля для нас быў і за бацьку, ратаваў у часы вайны (тату прызвалі яшчэ ў сорак першым, а ў сорак пятым прыслалі пахавальную).

...Можа, сотню разоў я звяртаўся ў розныя інстанцыі, але так і не даведаўся, дзе пахаваны бацька. А вось на магілу дзеда заўсёды хаджу. І з удзячнасцю ўспамінаю, бо ён ва ўсім для мяне быў прыкладам.

**Анатоль КАШЭВІЧ,**
*Лельчыцкі раён.*

■ Смех смехам

# ДЗЯДЗЬКА — НЕ БАЦЬКА

**Я — вяскоўка, жыву ў звычайнай хаце і, як на ліха, кожны год там нешта раблію: то ганак рамантую, то дзверы, то платы...**

Без мужчыны, самой, мне з такімі работамі ніяк не справіцца: з маладых гадоў удава. А таму і даводзіцца кожны раз шукаць чалавека.

...Гэты падрадзіўся мне дзверы паправіць. Прыйшоў, разлажыў патрэбны інструмент, можна сказаць, закасаў рукавы — прыступіў да работы. І яна, бачу, спорыцца.

— Малайчына ты, — хвалю чалавека. — Нехта ж навучыў цябе ўсё рабіць?! Мусіць, бацечка? Ён чалавек майстравы быў. І табе, відаць, перадалося: гены...

— Не, — перапыніў мой «маналог» мужчына, — Гена тут ні пры чым. Ён хоць і дзядзька мне, але ж колькі жыў, ніводнага цвіка не забіў... У яго хіба гультайству вучыцца, а вось бацька — той і праўда майстрам быў!

Яблык ад яблыні... Ці як там кажуць?

**С. АТРОХАВА,**
*в. Селішча, Слуцкі раён*

■ Навіны

## Спаборніцтва будучых паштальёнаў

**У Мінску прайшоў VIII конкурс прафесійнага майстэрства сярод навучэнцаў па спецыяльнасці «Паштовая сувязь». Восем каманд з усёй краіны спаборнічалі за званне найлепшай.**

У першы дзень журы правярала тэарэтычныя веды і практычныя навыкі будучых работнікаў сувязі. Канкурсантам трэба было адказаць на пытанні па спецыяльнасці і выканаць некалькі паштовых аперацый. Напрыклад, апрацаваць уваходную пісьмовую карэспандэнцыю, прыняць заказное пісьмо з паведамленнем аб уручэнні і пісьмо з аб'яўленай вартасцю. На другі дзень навучэнцы ўдзельнічалі ў віктарыне і паказвалі візітоўкі каманд і дамашняе заданне, прысвечанае Году малой радзімы. Акрамя гэтага, журы ацэньвала фірмавы стыль касцюмаў.

У выніку трэцяе месца заняла каманда Брэсцкага дзяржаўнага каледжа сувязі, другое — навучэнцы Мінскага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання. Першымі сталі студэнты Віцебскага філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі — Кацярына Аржаноўская, Уладзімір Карпаў і Кацярына Собалева. У наступным годзе менавіта Віцебск будзе прымаць конкурс прафесійнага майстэрства.

## Чый мост найлепшы?

**З 9 мая да 9 верасня праходзіць конкурс на найлепшую марку, выпушчаную па праграме «Еўропа». Яго праводзіць Асацыяцыя дзяржаўных паштовых аператараў Еўропы (PostEurop). Тэма гэтага года — «Масты».**

На конкурсе прадстаўлена і марка, выдадзеная Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Беларусі. На ёй — выява моста да Вострава Мужнасці і Жалю на рацэ Свіслач.

Прагаласаваць за нашу марку можа любы ахвотны. Для гэтага неабходна зайсці на сайт www.posteurop.org/europa2018, запоўніць кароткую анкету і аддаць свой голас за айчынную паштовую мініяцюру.

## Вестачкі малой радзіме

**Белпошта правяла для школьнікаў серыю майстар-класаў па вырабе паштоўкі «Малая радзіма». У канцы мая работнікі прадпрыемства пабывалі ў гімназіях №№ 37, 38 і 74. Другакласнікам і трэцякласнікам расказалі пра некаторыя прыёмы паэтапнага стварэння выявы. Дзеці намалявалі сваю маленькую радзіму і падпісалі паштоўку родным і блізкім. Гэтыя вестачкі пошта даставіць адрасатам бясплатна.**

Падчас майстар-класаў дзеці паказвалі свае калекцыі марак і паштовак. Напрыклад, трэцякласнік 38-й гімназіі Антон Лемяшэўскі ў посткросінгу не навічок. Сярод картак, якія сабраў хлопчык, ёсць экзэмпляры з Нідэрландаў, Расіі, ЗША, Тайваня. Для Антона перапіска — гэта магчымасць замацаваць веды па англійскай мове. Яго аднакласнік Мацвей Абрашын пахваліўся вялікай калекцыяй марак — у ёй каля 300 адзінак. Такі падарунак яму зрабіў дзядуля, які ўсё жыццё захапляўся філатэліяй і не вяртаўся з падарожжаў без новых мініяцюр. А Аляксей Арлоў у гэтым навучальным годзе нават абараніў навукова-даследчую работу на тэму «Паштоўкі цёплае прывітанне». Хлопчык вырашыў даведацца, наколькі папулярная паштоўка як сродак зносін сярод яго аднагодак, якія эмоцыі адчуваюць яе атрымальнікі.

Мерапрыемствы былі арганізаваны ў рамках праекта «Паштовая адукаванасць», які накіраваны на інфармаванне навучэнцаў аб паслугах пошты, посткросінгу, правільным адрасаванні ў гульнявой форме.

## Прыклад для іншых

**У Магілёве назвалі прадпрыемствы, якія будуць занесены на абласную Дошку гонару па выніках работы за 2017 год. Сярод арганізацый, што дасягнулі найлепшых паказчыкаў у сваёй дзейнасці, — Магілёўскі філіял Белпошты.**

Падчас уручэння пасведчання старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Даманеўскі адзначыў, што поспехі пераможцаў — прыклад для ўсіх астатніх. «Гэта людзі, якія аддаюць краіне свае веды, уменні і любоў», — падагульніў ён.

Дарэчы, на Гомельшчыне на Дошку гонару як найлепшы паштовы аб'ект занесены Рагачоўскі раённы вузел сувязі, а на Брэстчыне — Лунінецкі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ На маршруце

# АДЗІН ЗА ПЯЦЯРЫХ

## Колькі вёсак за дзень можа абслужыць мотадастаўка?

**Звычайна паштальёны абходзяць маршрут пешшу ці аб'язджаюць на веласіпедзе. Але ў сельскай мясцовасці куды зручней перасоўвацца на машыне: па-першае, адзін работнік можа ахапіць больш населеных пунктаў, па-другое, прасцей дастаўляць тавары (усё ж такі багажнік аўто змяшчае больш, чым сумка). Менавіта таму пошта развівае мотадастаўку. Напрыклад, у Лагойскім раёне такі від абслугоўвання працуе на трох маршрутах. Мы праехаліся разам з работнікам аддзялення Пятром САЕВІЧАМ і паглядзелі, колькі можна паспець за дзень.**

Пётр Міхайлавіч — адзін са «старажылаў» Лагойскай пошты. Працуе тут з 1992 года. Спачатку быў проста кіроўцам, а апошнія сем гадоў — кіроўцам-паштальёнам. Прызнаецца, што адразу было крыху складана навучыцца распісваць газеты, а астатнія абавязкі лёгка асвоіў.

Прафесію мужчына выбраў па прыкладзе бацькі.

— Ён у саўгасе працаваў кіроўцам, — расказвае суразмоўнік. — Я з трох гадоў з ім ездзіў. Садка ж у вёсцы не было, бацька і браў мяне з сабой у машыну. Там і паспіш, і паабедаеш. У дарозе ўсё было смачна: сухарыкі, хлеб з салам. Так і прывучыўся. Брат мой таксама кіроўцам стаў — можна сказаць, дынастыя.



У некаторыя вёскі заязджаем дзеля адной газеты.



Ларыса ПАЎЛАВА з вёскі Зялёны Сад аплачвае праз пошту «камуналку» і заказвае пральны парашок.

Сам Пётр Саевіч пасля арміі шэсць гадоў працаваў у Мінску ў аўтобусным парку. Потым уладкаваўся ў будаўнічую арганізацыю. Но калі зрабілі аперацыю на руцэ і забаранілі падымаць цяжкасці, перавёўся на пошту. Чаму прамяняў сталіцу на райцэнтр? У Мінску тады не было перспектывы пабудаваць кватэру, давалі толькі месца ў інтэрнаце. Пятра Міхайлавіча, які якраз ажаніўся, такі варыянт не задавальняў — з дзецьмі будзе цесна. Вось і купіў дом у Лагойску. Тым больш што гэтыя мясціны для яго родныя: мужчына родам з вёскі Прудзішча Лагойскага раёна.

Службовае «пежо» ўжо загружана — час адпраўляцца на маршрут. Сёння гэта 26 вёсак, дзе трэба раскідаць газеты, перадаць некалькі лістоў і пасылку. Плюс яшчэ сабраць у Лагойску лісты са скрыняў і ў двух банках прыняць дакументацыю. Усяго — 133 кіламетры. У некаторыя дні, калі трэба заехаць у аддаленыя населеныя пункты, кіламетраж можа дасягаць і 160—170. Раней, каб ахапіць гэты ўчастак, патрэбна было пяць-шэсць «пешых» паштальёнаў, а цяпер спраўляецца адзін на аўто. За тым, каб кіроўца не адхіляўся ад маршруту і не прапусціў ніводнага адрасата, сочыць сістэма навігацыі.

У дарозе любуемся прыродай навокал. І крыху зайздросцім паштальёну: такое хараство бачыць штодзень!

— Лагойшчына — прыгожыя мясціны, — пагаджаецца з намі загарэлы Пётр Міхайлавіч. — А на маім папярэднім маршруце, дзе вёскі Алешнікі, Моладзі, яшчэ лепш: адны ўзгоркі. Там, дарэчы, самыя грыбныя мясціны. Калі сезон пачынаецца, не праехаць. Машын мора, усе з'езды на абодвух баках дарогі занятыя.

Мужчына заўважае: кожная пара года цікавая пасвойму. «Узімку едзеш, глянеш на ўзбочыну — след на снезе: нехта са звяроў прайшоў уночы». У слядах Пётр Міхайлавіч разбіраецца — ён паляўнічы са стажам. З лістапада і да канца студзеня прападае ў лясах. Жартуе, што палюе на ўсё, што бегае. У асноўным на зайца, а калі адкрываецца загоннае паляванне, то і на лася, кабана, казулю.

Паштальён глушыць машыну. У некаторыя вёскі, напрыклад Малінаўку, ён заязджае толькі дзеля адной газеты. Апускаем яе ў скрыню і рушым далей. Самыя напружаныя дні, па назіраннях мужчыны, — серада і субота. У гэты час выходзяць многія штотыднёвікі, таму развезці прэсы трэба ўдвая больш, чым звычайна.

На панэлі аўто ляжаць маленькія паперкі, змацаваныя сашчэпкай. «Гэта шпаргалачкі з прадуктамі, — тлумачыць кіроўца. — Я папярэдне запісваю, каму якія тавары патрэбны, каб наступны раз прывезці. Звычайна просяць муку, цукар, алей, макарону, камбікорм для курэй. У многіх мой тэлефон запісаны — званяць, заказваюць».

Людзі ўвогуле прывязваюцца да паштальёна. Пётр Міхайлавіч успамінае, што, калі тры гады таму яго перавялі на новы маршрут, пенсіянеры з папярэдняга ўчастка тэлефанавалі ў аддзяленне, прасілі вярнуць іх кіроўцу.

У вёсцы Зялёны Сад, калі падыходзім да аднаго з дамоў, першым нас заўважае сабака. Ускоквае на будку і сустракае гучным брэхам.

— Малайчына, хлеб адпрацоўвае, — усміхаецца Пётр Міхайлавіч.

Пачуўшы нас, з агарода паказваецца гаспадыня. Сёння для яе толькі газета. Але Ларыса Паўлава расказвае, што ў дзень, калі атрымлівае пенсію, адразу ж аплачвае праз пошту камунальныя паслугі, часта заказвае тавары.

— Пральны парашок, цукар, — пералічае жанчына. — У нас тут магазіна няма, толькі аўтакрама прыязджае.

— А на пошце некаторыя прадукты нават таннейшыя, — дадае мужчына. І ўспамінае, як на мінулым маршруце за жнівень дзве тоны цукру прадаў: — Яго шмат бралі на падкормку пчолам. У той мясцовасці іх многія трымаюць, па 30—40 вулляў на пасеках стаіць.

Далей едзем перадаць пару лістоў. Аднаму мужчыну — паведамленне з работы, іншаму — ад натарыуса. І зноў за руль.

— Цяпер дарога нармальная, а ўзімку і ўвосень па вёсках складана бывае праехаць, — прызнаецца кіроўца. — Калі «Хаўер» быў, да аднаго сяла два тыдні дабрацца не мог. Памятаю, калі дарогу нарэшце пачысцілі, гурбы на ўзбочынах былі вышэйшыя за машыну. Добра, бабка ў той вёсцы яшчэ раней накупіла мукі і алею. Хлеба ўжо не засталося ў яе, адны бліны ела. Радавалася майму прыезду, на ўсялякі выпадак набрала прадуктаў паболей.

**Раней, каб ахапіць гэты ўчастак, патрэбна было пяць-шэсць «пешых» паштальёнаў, а цяпер спраўляецца адзін на аўто.**

На рабоце Пётр Міхайлавіч з сямі раніцы да чатырох дня. А па вечарах і на выхадныя звычайна працуе на прысядзібным участку: як-ніяк 12 сотак зямлі. У мінулую нядзелю вось дзьмухаўцовы сенакос на цэлы дзень быў. Жонка паштальёна — былы дыспетчар МНС — ужо на пенсіі. «Як нарадзіўся ўнучак, дык яна адразу пайшла на заслужаны адпачынак», — смяецца Пётр Міхайлавіч.



Пётр САЕВІЧ уручае ліст мясцовай жыхарцы.

Ён увогуле шмат усміхаецца. Быццам і не стамляецца за дзень за рулём.

— За столькі гадоў прывык. Ужо хутка мемуары можна пісаць: 40 гадоў дарога перад вачыма. Будзе што на пенсіі ўспомніць.



Цукар — адзін з самых запатрабаваных тавараў на вёсцы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**
*Лагойскі раён*

БЕЛЭКСІМГАРАНТ
EXIMGARANT OF BELARUS

# ЗАПАСНЫ ПАРАШУТ ДЛЯ ЭКСПАРЦЁРА

**Новыя дзейсныя інструменты падтрымкі айчынных прадпрыемстваў-экспарцёраў актыўна рэалізуюцца ў мінскім абласным філіяле Беларускага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант». Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з выконваючым абавязкі дырэктара філіяла Аляксандрам ЦІМАШЫШЫНЫМ.**



## ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎНІКА

Аляксандр Цімашышын у сістэме Белэксімгаранта дванаццаць гадоў. Прыйшоў сюды пасля заканчэння Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Хоць першы свой досвед страхавога агента атрымліваў яшчэ студэнтам.

Пасля абароны дыплома працаваў спецыялістам у галіне абавязковага страхавання, пазней — экспартнага страхавання. «Збіралася маладая каманда, якім гэта было цікава, усе з веданнем замежнай мовы, яны былі фанатамі новай справы», — пазней скажа ён.

Завочна закончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У цэнтральным апараце быў намеснікам начальніка ўпраўлення экспартнага страхавання, цяпер выконвае абавязкі кіраўніка філіяла «Белэксімгарант — Мінская вобласць». Падчас гутаркі з карэспандэнтам «Звязды» шмат цёплых слоў выказаў у адрас маладога і надзвычай прафесійнага, як ён зазначыў, калектыву філіяла, работай якога ён абсалютна задаволены. Сапраўдная каманда, лічыць Аляксандр Мікалаевіч.

— Апошнім часам мы, — падкрэслівае Аляксандр Цімашышын, — зрабілі буйны крок насустрач сваім партнёрам у рамках нашага асноўнага рабочага дакумента — Указа Прэзідэнта № 534 «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў, работ і паслуг». Прадугледзелі шэраг новых прадуктаў, якія, на нашу думку, павінны дапамагаць айчынным экспарцёрам прасоўваць сваю прадукцыю на новыя рынкі збыту. У першую чаргу «запусцілі» такі інструмент фінансавання, як міжнародны экспартны факторынг, пры якім прадпрыемствы могуць атрымліваць дастаткова льготнае фінансаванне, каб выраблядь прадукцыю і пастаўляць яе на экспарт.

***— Вы можаце фінансаваць такім чынам любы экспартны кантракт?***

— Абсалютна любы і ў любую краіну свету. І найчасцей робім гэта ў доларах, еўра ці расійскіх рублях. Стаўкі — ніжэйшыя за дзеючыя рынкавыя, што для кліента важна.

Прадукт гэты абсалютна новы, рэальна ён пачаў дзейнічаць у канцы мінулага года. Тады намі была падрыхтавана карпаратыўная база дакументаў, распрацаваны лакальныя дакументы, у якіх мы пастараліся забяспечыць найбольш камфортныя ўмовы і для беларускіх банкаў, што ажыццяўляюць фінансаванне, і для айчынных прадпрыемстваў любой формы ўласнасці. Праз газету «Звязда» запрашаем іх больш актыўна карыстацца гэтым вельмі выгадным і зручным для іх інструментам.

Перад тым як зрабіць новы крок у развіцці, пры падтрымцы Мінаблвыканкама і ўдзеле банкаў мы правялі навучальны семінар-трэнінг для дзелавых партнёраў, у якім узялі ўдзел больш за сто прадстаўнікоў прадпрыемстваў-экспарцёраў. Расказалі ім пра свой «інструментарый», пра ўсе навінкі, сабралі прапановы па далейшым супрацоўніцтве.

Такім чынам, у новы гаспадарчы год мы ўвайшлі, маючы дакладнае разуменне, як прасоўваць новы прадукт. З другога боку было разуменне банкаў і іх гатоўнасць да супрацоўніцтва, а таксама гатоўнасць куратара — Міністэрства фінансаў у рамках заканадаўства падтрымліваць нашу дзейнасць.

Экспартны факторынг — наша ноу-хау, і ён будзе добра дапамагаць прадпрыемствам заваёўваць новыя рынкі збыту.

Што датычыцца наогул стварэння камфортных умоў для суб'ектаў гаспадарання, то сёння канкурэнцыя за кліентаў не толькі ў бізнесе, але і сярод страхаўшчыкоў дастаткова высокая, і мы павінны забяспечыць для кліентаў дзве асноўныя камфортныя ўмовы — цану і якасць. Якасць з нашага боку — гэта ў першую чаргу прафесійны аналіз контрагента. Вы цудоўна разумееце, што замежныя партнёры могуць быць розныя. Таму пад якасцю я разумею глыбіню аналізу контрагента і выбудоўванне такой схемы, такога ланцужка рэалізацыі прадукцыі, каб і прадпрыемства, і мы былі ўпэўнены: калі прадалі тавар, то грошы за яго атрымаем. Калі ж такога яскравага бачання няма, то пачынаем разам з прадпрыемствам і банкамі выпрацоўваць дадатковыя інструменты, якія дапамогуць атрымаць валютную выручку.

Мы можам падказаць свайму кліенту спецыфіку той ці іншай краіны, нюансы яе заканадаўства, эканамічнае становішча замежнага контрагента. Па многіх вядзём базы дадзеных, дзе адлюстраваны статус, фінансавае становішча, дзелавая рэпутацыя і іншыя важныя карысныя звесткі. Можам зрабіць свой прагноз, ці здольны ён разлічыцца з беларускім пастаўшчыком, — з канкрэтнымі лічбамі і фактамі на руках.

Што да цаны, то імкнёмся, каб механізмы экспартнага фінансавання ў рамках 534-га ўказа былі для прадпрыемстваў больш прымальныя, нават больш выгадныя, чым тыя, што дзейнічаюць цяпер на рынках.

Не меншае значэнне ў рабоце з экспарцёрамі мае і аператыўнасць. Гэта таксама адзін з законаў дзелавога жыцця.



Я заўсёды тлумачу сваім маладым калегам, што калі мы не будзем працаваць аператыўна і якасна, то будзем працаваць аднаразова. Ёсць нават такая прыкмета: калі ты прадаў тавар ці паслугу адзін раз — гэта добра. Прадаў другі раз — гэта ўжо твой кліент.

***— А якія зараз тэндэнцыі ў даволі далікатнай сферы вашай дзейнасці?***

— На рынках назіраецца зніжэнне ставак па фінансаванні. І калі мы з улікам гэтага не зможам прапанаваць прадпрыемству-экспарцёру найбольш выгадныя ўмовы, перш за ўсё па цане, то свайго кліента не ўтрымаем.

**— У свеце ўскладнілася міжнародная абстаноўка, узраслі так званыя палітычныя рызыкі. Ці адбіваецца гэта на працы Белэксімгаранта і яго філіялаў?**

— Мы працуем на апярэджанне, каб не зменшылася колькасць плацяжоў у адрас Беларусі. Калі за мяжой, у той ці іншай краіне, намячаюцца ці пачынаюцца хваляванні, канфрантацыя палітычных сіл ці, горш за тое, — ваенныя дзеянні, мы звяртаем увагу прадпрыемстваў-экспарцёраў, раім спыніць пастаўкі, пакуль вастрыня сітуацыі не будзе знятая.

Наогул, у кожным рэгіёне свая спецыфіка. Просты прыклад. Айчынныя прадпрыемствы, а ўслед за імі і мы, актыўна працуем у рэгіёне Паўднёва-Усходняй Азіі — Сінгапур, В'етнам, Інданезія і гэтак далей, і гэта велізарны рынак. Партнёры з гэтага рэгіёна гатовы купляць беларускую тэхніку, беларускую прадукцыю наогул. Але асноўным стрымлівальным фактарам з'яўляюцца іх умовы плацяжу. Там бізнес не ведае, што такое папярэдняя аплата за тавар і нікому яе плаціць не збіраецца. Наадварот, яны гатовы працаваць на ўмовах адтэрміноўкі плацяжу — ад года і вышэй. Гатовы купляць беларускае, але — дайце адтэрміноўку плацяжу ад года і вышэй... Па такіх правілах у гэтым рэгіёне працуе 90 % сусветнага бізнесу. Бо гэта надзвычай ёмістыя рынкі, там ёсць грошы, іх проста патрэбна правільна ўзяць.

І ў нашай краіне дзяржава зрабіла ўсё для таго, каб выходзіць на гэтыя рынкі. Ёсць абсалютна ўсё, у тым ліку і дзяржаўны страхаўшчык у асобе Белэксімгаранта, які ўпаўнаважаны дапамагаць заваёўваць гэтыя рынкі. Так, яны надзвычай складаныя: існуе моўны бар'ер, іншы менталітэт, свае традыцыі, свая рэлігія... І мы, з прычыны аддаленасці, не заўсёды ўсё ведаем. І ў той жа час нашу прадукцыю гатовы купляць у розных краінах свету. Безумоўна, з кожным рэгіёнам і з кожнай краінай пытанні супрацоўніцтва вырашаюцца не так хутка, як хацелася б, але мы абавязаны набрацца цярпення і крок за крокам працаваць з замежнымі партнёрамі. Бо патэнцыял, назапашаны ў нашым рэальным сектары, павінен рэалізоўвацца за мяжой і прыносіць карысць беларускай дзяржаве.

Дарэчы, беларускім прадпрыемствам працаваць на ўмовах працяглай адтэрміноўкі плацяжу і пры гэтым быць абароненымі дапаможа наш новы прадукт — экспартны факторынг.

Нашы прадпрыемствы апошнім часам больш прафесійна працуюць на замежных рынках. На многіх з іх ствараюцца структуры па вывучэнні контрагентаў, у адрас якіх плануюцца ці ўжо ажыццяўляюцца пастаўкі прадукцыі. Гэта сведчыць аб сталым падыходзе, узрослым прафесіяналізме. І гэта трымае ў «тонусе» замежных спажыўцоў, якія бачаць у нашай краіне сур'ёзнага партнёра з адладжанай экспартнай палітыкай.

Вырашаючы дзелавыя пытанні, мы стараемся працаваць з нашымі кліентамі не разрозннена, а трымаемся разам, адным «кулаком», і сумесна адстойваем свае пазіцыі — прадпрыемства-экспарцёр, банкі, страхаўшчык.

***— Нядаўні візіт кіраўніка дзяржавы ў Таджыкістан дадасць вам працы, як вы адчуваеце?***

— Такія візіты Прэзідэнта заўсёды дадаюць працы, бо адкрываюцца новыя рынкі ці пачынаюць больш актыўна працаваць традыцыйныя. Гэта імпульс для новых ідэй, распрацоўкі новых страхавых прадуктаў, і гэты момант важна не ўпусціць, пакуль уражанні ад сустрэч на вышэйшым узроўні з абодвух бакоў зусім свежыя, усе гатовыя працаваць. Разумееш, што ў цябе ёсць плячо дзяржавы з двух бакоў, гэта важна і вельмі дапамагае ў рабоце.

***— Нядаўна ў Старых Дарогах з задавальненнем даведаліся, што на мясцовы плодаагароднінны завод, філіял Слуцкага цукроварафінаднага камбіната, прыязджалі спецыялісты з Ізраіля, праверылі прадукцыю пад брэндам «СтаДар» і прыйшлі да высновы, што яна цалкам кашэрная, і вядуцца перамовы аб пастаўках. Якія ў вас адносіны з дзелавымі коламі Ізраіля, які ўсё больш пранікае ў нашу эканоміку?***

— Бізнес толькі пачынае знаходзіць агульныя кропкі для супрацоўніцтва, з улікам нацыянальных асаблівасцяў, той жа кашэрнасці. Як масавую з'яву ў вобласці ацэньваць пакуль рана, робяцца першыя крокі. Больш высокі ўзровень гандлёвых адносінаў хутчэй за ўсё чакае нас наперадзе. Новы рынак — новая спецыфіка, новыя рызыкі, усё патрабуе вывучэння. Я згодны, што больш актыўна працаваць на перспектыўным рынку гэтай няблізкай краіны варта менавіта зараз, пакуль там ёсць значная праслойка людзей, што выехалі з Саюза, і ў тым ліку з Беларусі. З цягам часу новыя пакаленні будуць успрымаць беларускі вектар без настальгічнай цеплыні, якая існуе цяпер.

Безумоўна, перспектыўны кітайскі рынак. Таму падпісалі дакумент аб супрацоўніцтве з роднасным экспартна-імпартным агенцтвам страхавання Кітая і дапамагаем адно аднаму ў вывучэнні прадпрыемстваў-контрагентаў. Рынак пакуль таксама новы для нас, і аб'ём страхавога пакрыцця пакуль невялікі, але ўсё ёсць для таго, каб паспяхова працаваць у рэгіёне, — і беларускім прадпрыемствам-экспарцёрам, і нам.

Калі абагульняць, то за ўвесь час экспартнае пакрыццё прадастаўлена больш чым у 60 краін свету. Сярод іх былі і не зусім для нас звыклыя напрамкі, такія як Аўстралія, Куба, краіны Поўдня Афрыкі, Афганістан. Гэтыя рынкі складаныя і для прамысловых прадпрыемстваў, але мы даём ім інструмент, запасны парашут, і прапануем выходзіць на новую эканамічную, гандлёвую прастору смялей. З намі сапраўды і смялей, і надзейней, практыка пацвярджае. Толькі адзін факт. За перыяд дзеяння Указа № 534 Белэксімгарантам было вернута краіне больш чым 12 млн долараў.

***— Ці ёсць сярод вашых кліентаў прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу?***

— Робім нават упор на такі кірунак, за ім будучыня, пра што сведчыць замежная практыка. У вобласці шмат вельмі цікавых прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу, якія выпускаюць найунікальнейшую прадукцыю. Ведаю прадпрыемства ў свабоднай эканамічнай зоне «Мінск», аднатыпных якому ўсяго шэсць у свеце.

Разам з усім калектывам Белэксімгаранта працуем над стварэннем спецыяльных накірункаў, спецыяльных страхавых прадуктаў менавіта для суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Так, гэта невялікія прадпрыемствы, але яны выпускаюць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю, пастаўляюць яе на нетрадыцыйныя рынкі збыту, чаго і патрабуе ўрад. І з 15 новых кліентаў, што мы прыцягнулі да экспартнага страхавання за апошні час, палова — суб'екты малога і сярэдняга бізнесу, на якіх працуе да 100–250 чалавек. Але экспартная пазіцыя ў іх дастаткова сур'ёзная.

Калі мець на ўвазе, што ўрад прадпрымае новыя крокі па спрашчэнні работы гэтых суб'ектаў гаспадарання, то мы не можам заставацца ўбаку. Прыемна, што нашай навінкай — экспартным факторынгам — прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу пачалі карыстацца дастаткова актыўна і эфектыўна.

***— Такім чынам, больш за трэць дагавораў у вашым партфелі...***

— ...звязаны з экспартным страхаваннем у рамках 534-га Указа Прэзідэнта. Але ёсць і традыцыйныя для ўсяго страхавога рынку паслугі, у тым ліку па абавязковым, а таксама добраахвотным і медыцынскім страхаванні. Скажам, медыцынскае страхаванне — дастаткова эфектыўны кірунак дзейнасці, бо прадпрыемствы ўсё часцей пераходзяць на цывілізаваныя спосабы матывацыі людзей, і мы дапамагаем наймальнікам падтрымліваць свае калектывы. Гэта цікавы і перспектыўны страхавы прадукт, ён вельмі папулярны ў Рэспубліцы Беларусь, і тут мы таксама імкнёмся працаваць якасна, бо маем справу з людзьмі, іх здароўем.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ,**
**Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Здымкі прадстаўлены Белэксімгарантам.**

Ад рэдакцыі. Шчыра дзякуем за садзейнічанне ў падрыхтоўцы публікацыі **начальніку службы па сувязях з грамадскасцю і рэкламе «Белэксімгарант» Дар'і ІБРАГІМАВАЙ.**



Каманда філіяла «Белэксімгарант – Мінская вобласць» стала бронзавым прызёрам V спартакіяды «Белэксімгарант».

**Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант». УНП 101421509.**
**Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 2200/13 — 00049 на права ажыццяўлення страхавой дзейнасці. Выдадзены 23 красавіка 2008 года Міністэрствам фінансаў РБ.**

■ Будучыня побач

# ЧАЛАВЕК ДАРУЧАЕ ЗБРОЮ МАШЫНАМ

## Штучны інтэлект у ваеннай сферы пакуль што небяспечны?

**Да нядаўняга часу штучны інтэлект знаходзіў сваё выкарыстанне толькі ў даследчых і, калі можна так выказацца, «бытавых» аспектах нашага жыцця. Але цяпер усё часцей можна пачуць пра тое, што AI будуць інтэграваць і ў ваенную сферу. Напрыклад, улады Вялікабрытаніі заявілі пра адкрыццё цэнтра ваенных распрацовак, ключавую ролю ў якім будзе іграць менавіта штучны розум.**



Стары сюжэт у новым кіно. У свеце коміксаў «Марвел» штучны інтэлект Альтрон быў створаны людзьмі з галоўнай мэтай: абарона Зямлі ад знешніх пагроз. Аднак ён перастаў падпарадкоўвацца чалавеку і ўсвядоміў людзей (балазе, спачатку толькі супергерояў) як галоўную пагрозу жыцця. «Вы хочаце зберагчы Зямлю, але працівіцеся эвалюцыі. У чым сэнс чалавецтва, якое спынілася ў развіцці?» — пытаецца Альтрон. Пакуль яшчэ такі варыянт развіцця падзей існуе толькі ў выглядзе забаўляльнай кінафантастыкі, але ці толькі там ён застанецца?..

Цэнтр будзе размешчаны на тэрыторыі брытанскага горада Портан-Даўн. На першым этапе навукоўцы комплексу будуць вывучаць магчымасць прымянення AI для кіравання беспілотнай тэхнікай, сістэмамі камп'ютарнай бяспекі, садзейнічання каманднаму складу і дапамогі ў каардынацыі дзеянняў на полі бою, а таксама ў сферы працідзеяння інфармацыйнай вайне. Як заявіў міністр абароны Злучанага Каралеўства Гэвін Уільямсан, «сустрэча навукоўцаў і ваенных экспертаў прымушае нашы самыя выбітныя розумы развіваць новыя магчымасці, пасля чаго найноўшыя распрацоўкі можна будзе ўкараніць у сістэмы аўтаномнага вядзення бою і нават у робататэхніку». Улады Вялікабрытаніі ўжо выдаткавалі амаль мільярд долараў ЗША на развіццё сістэм штучнага інтэлекту ў ваеннай сферы і плануюць далей развіваць гэтую галіну. Шматлікіх экспертаў палохае падобная перспектыва, бо ўсе мы ведаем нямала літаратурных і кінематаграфічных твораў, па сюжэце якіх збунтаваны AI паўстае супраць чалавецтва. Аднак, паводле заяў навукоўцаў, турбавацца не варта, бо ў дадзены момант AI знаходзіцца на тым этапе, калі ён арыентаваны толькі пад выкарыстанне пэўных задач і не валодае належнай самастойнасцю ў прыняцці рашэнняў.

Паводле даных СМІ, колькасць брытанскай арміі ў цяперашні час скарацілася да мінімуму з часоў Першай сусветнай вайны з-за праблем са здароўем ваеннаслужачых і недастатковага набору. У поўнай баявой гатоўнасці зараз знаходзяцца толькі каля 60 тысяч чалавек, што менш, чым у арміях Іспаніі і Польшчы.

Нядаўна навукоўцы з універсітэта Паўднёвай Каліфорніі і лабараторый арміі ЗША стварылі сістэму штучнага інтэлекту, якая дазваляе салдатам трэніраваць уважлівасць, памяць і рацыянальнасць. Гэта ў 13 разоў паскорыла іх навучанне. У Акадэміі ВПС ЗША таксама распрацоўваюць алгарытм аўтапілота, які дазволіць дронам атакаваць іншыя беспілотнікі, а таксама ўхіляцца ад сустрэчных нападзенняў. Плануецца, што дроны змогуць выконваць усе асноўныя пілатажныя баявыя фігуры, якія тэхнічна будуць даступныя.

Між тым 15 мая стала вядома, што каля 10 супрацоўнікаў Google вырашылі звольніцца з кампаніі менавіта ў знак пратэсту супраць супрацоўніцтва карпарацыі з міністэрствам абароны ЗША ў рамках рэалізацыі праекта па ўкараненні штучнага інтэлекту

❍ Дарэчы

Яшчэ ў 2015 годзе Стывен Хокінг, Ілан Маск, Стыў Вазняк і іншыя знакамітыя навукоўцы і вынаходнікі напісалі адкрыты ліст, у якім выказалі сур'ёзную асцярогу з нагоды стварэння зброі са штучным інтэлектам, якая цалкам рэальна будзе пагражаць існаванню чалавецтва. Яны запатрабавалі ад сусветнай супольнасці забараніць яе выкарыстанне. Ліст таксама падпісалі сотні даследчыкаў у галіне штучнага інтэлекту і робататэхнікі.

Аўтары ліста асцерагаліся «глабальнай гонкі AI-ўзбраенняў» і прадказвалі, што «самакіравальныя дроны стануць «Калашнікавым» найбліжэйшай будучыні». Пры гэтым навукоўцы разумеюць, што тэхналогіі штучнага інтэлекту могуць прынесці карысць чалавецтву, аднак прымяненне AI-ўзбраенняў павінна быць забаронена міжнароднымі дагаворамі, як гэта ўжо зроблена з хімічнай і біялагічнай зброяй. Асцярога навукоўцаў датычылася не толькі ваенных дронаў, але і многіх іншых відаў узбраенняў, такіх як стратасферныя або арбітальныя лазеры.

Абаронцы AI-ўзбраення, у сваю чаргу, сцвярджалі, што іх распрацоўка матывуе іншыя краіны перайсці на ўдзел баявых робатаў у ваенных канфліктах замест людзей. Навукоўцы раскрытыкавалі такія развагі і заявілі, што аўтаномныя дроны ідэальна падыходзяць для кропкавай ананімнай ліквідацыі ключавых членаў грамадства, дэстабілізацыі палітычнай сітуацыі, выбарнага знішчэння прадстаўнікоў пэўных этнічных груп.

Аўтары таго ліста адзначылі, што аўтаномныя віды ўзбраенняў сталі трэцяй рэвалюцыяй у ваеннай галіне пасля вынаходства пораху і ядзернай зброі. Дзве папярэднія змянілі сусветны парадак, і трэцяя можа зрабіць тое ж самае. Яшчэ адной пагрозай з'яўляецца ўразлівасць камп'ютарных сістэм для хакерскіх нападаў. Эфектыўна выкарыстоўваць кіберзброю сёння могуць не толькі буйныя сусветныя дзяржавы, але і шэраг аўтарытарных дзяржаў і тэрарыстычных груповак. Узлом вытворчай лініі ваенных дронаў і іх перапраграмаванне могуць прывесці да непрадказальных наступстваў ■

■ А вы ведалі?

# І ПАШТАЛЬЁНЫ, І РАЗВЕДЧЫКІ

## Як галубы рабілі першыя аэрафотаздымкі

**Першыя ў свеце аэрафотаздымкі былі зробленыя ў 1858 годзе паветраплавальнікамі, а затым на дапамогу ім прыйшлі паштовыя галубы.**



Юліус Нойбранер.

Здымка Зямлі з вышыні ўпершыню была праведзена ў 1858 годзе над Парыжам: першаадкрывальнікам стаў фатограф і паветраплавальнік Гаспар-Феліск Турнашон, вядомы пад псеўданімам Надар. Ён нават запатэнтаваў ідэю фатаграфавання з паветранага шара. У 1887 годзе французскі фатограф Артур Батут адправіў у неба паветранага змея, абсталяванага камерай. Затым фотаапарат размяшчалі на невялікай ракеце з парашутам, і гэтай тэхнікай у 1897 годзе скарыстаўся нават Альфрэд Нобель.

У пачатку ХХ стагоддзя нямецкі аптэкар Юліус Нойбранер прапанаваў «Спосаб і сродкі для фатаграфавання пейзажаў зверху» з дапамогай паштовых галубоў. Раней ён, як і яго бацька, выкарыстаў гэтых птушак для перадачы рэцэптаў і лекаў у найбліжэйшы санаторый. Пасля таго як адзін з галубоў страціў арыентацыю ў тумане і вярнуўся толькі праз чатыры тыдні сытым і здаровым, Нойбранер вырашыў забяспечыць птушак аўтаматычнымі камерамі, каб прасачыць іх шлях.



Ён адбіраў найбольш моцных галубоў, адвозіў іх прыкладна на 100 кіламетраў ад дома, дзе абсталёўваў камерамі ўласнай канструкцыі. Камера з двума аб'ектывамі прымацоўвалася з дапамогай нагрудных рамянёў, напампаваных паветрам. Калі птушка ўзлятала ў неба, паветра павольна выходзіла, вызваляючы клапан, дзякуючы якому спрацоўваў затвор. У сваю чаргу птушкі, імкнучыся хутчэй вызваліцца ад грузу, ляцелі дадому па прамой на вышыні ад 50 да 100 метраў, робячы такім чынам здымкі з вышыні. Гэты спосаб карыстаўся поспехам, а ў 1909—1911 гадах заваяваў узнагароды на міжнародных выстаўках у Дрэздэне, Франкфурце і Парыжы. Галубіныя фотаздымкі выкарыстоўваліся нават падчас Першай сусветнай вайны для вядзення паветранай разведкі.

Усяго Нойбранер распрацаваў каля дзясятка розных мадэляў камер і мабільную галубятню, запатэнтаваўшы іх у шэрагу еўрапейскіх краін. А пазней на змену гэтай тэхніцы прыйшла авіяцыйная фатаграфія ■

# Колькі электраэнергіі спажывае біткойн

**На дадзены момант майнінг* біткойна патрабуе вялікай колькасці ўкладанняў і вельмі спецыфічнага абсталявання. Для большасці будзе прасцей купіць валюту на біржы, але гэта не значыць, што майнінг запаволіўся. Для здабычы гэтай валюты выкарыстоўваецца ўсё больш магутнасцяў. А колькі на гэта трацiцца электраэнергіі?**



Чакаецца, што да канца 2018 года сусветная сетка біткойна будзе выкарыстоўваць 7,67 гігавата электраэнергіі на астуджэнне і апаратныя сродкі. Гэта адна сотая доля ўсёй электрычнасці, якая выкарыстоўваецца ўсёй планетай, адзін працэнт.

Паводле даследавання, якое можна крытыкаваць за адсутнасць належнай дакладнасці і выкарыстанне ўсярэдненых даных, сетка біткойнаў у цяперашні час выкарыстоўвае столькі ж электраэнергіі, колькі расходуе Ірландыя (3,1 гігавата). У будучыні спажыванне можа вырасці да ўзроўню Аўстраліі (8,2 гігавата). Зразумела, гэта не значыць, што пара адмаўляцца ад крыптавалют, якія многімі расцэньваюцца як паваротны момант у нашай гісторыі. Але зірніце, наколькі моцны ўплыў яны аказваюць на наш свет. Калі крыптавалюты стануць грашыма будучыні, то чалавецтву прыйдзецца паклапаціцца аб экалогіі гэтай будучыні, бо хутка на валюты будзе выкарыстоўвацца столькі энергіі, колькі не расходуе ніводная развітая прамысловая нацыя.

*Майнінг — працэс здабычы біткойна і іншых крыптавалют, калі мноства не злучаных паміж сабой камп'ютараў праз спецыяльную праграму (майнер) вырашаюць розныя матэматычныя вылічальныя задачы.

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

# УСЕ — НА ДЫСПАНСЕРЫЗАЦЫЮ!

## Медыкі дапамаглі работнікам ААТ «Камволь» больш даведацца пра сваё здароўе

**Слова «дыспансерызацыя» работнікаў ААТ «Камволь» відавочна не палохае. Да 9 гадзін раніцы, калі ў здраўпункце прадпрыемства павінны былі з'явіцца медыкі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска, у калідоры сабралася нават невялікая чарга. «Нікога не прымушаем, усе прыходзяць добраахвотна», — тлумачыць намеснік генеральнага дырэктара Алена Пляскова. Карэспандэнты «Звязды» паназіралі, як праходзіць гэта медыцынская акцыя на буйным тэкстыльным прадпрыемстве.**



Здаць аналіз крыві, зрабіць электракардыяграму, атрымаць кансультацыю тэрапеўта і акушэра, а таксама парады па здаровым ладзе жыцця — гэта можна зрабіць, не пакідаючы вытворчых карпусоў. Усім ахвотным, у прыватнасці, можна ацаніць ступень рызыкі смяротнага выпадку ад сардэчна-сасудзістых хвароб у наступныя 10 гадоў, якая вызначаецца па табліцы SCORE з улікам полу, узросту, акружнасці таліі, узроўню халестэрыну і іншых паказчыкаў.

— Добра, што ёсць магчымасць прайсці такі агляд, — кажа кантралёр тэхналагічнага працэсу Соф'я Гурская, якая працуе на прадпрыемстве 42 гады. — Да паліклінікі не заўсёды ёсць час дайсці, калі ўвесь дзень на працы. Было б добра, калі б да нас прыходзілі і спецыялісты вузкай накіраванасці, напрыклад гінеколагі.

— Гэтыя пытанні вырашальныя, — рэагуе Алена Пляскова. — Будзем дамаўляцца з паліклінікай, каб або да нас прыходзілі ўрачы, або выдзелілі пэўныя часы для прыёму нашых работнікаў.

Жанчыны ў чаканні медыкаў прыгадваюць, што калісьці цяперашняя 11-я паліклініка належала камбінату, а ўрачы рэгулярна наведваліся ў вытворчыя цэхі. Прадстаўніц прыгожай паловы на прадпрыемстве, дарэчы, пераважная большасць — тры чвэрці, што, уласна, відаць і па тых, хто прыйшоў на агляд, — у чарзе няма ніводнага мужчыны. Многія работніцы аддалі «Камволю» не адно дзесяцігоддзе.

— Частка нашых работнікаў працуе ў шкодных умовах — гэта пастаянны шум і пыл. Таму і на пенсію ідуць раней, жанчыны — у 50 гадоў. Але многія выказваюць жаданне застацца працаваць, і мы ідзём насустрач. Праўда, паступова калектыў амаладжваецца, сёлета да нас прыйшло больш за 60 маладых спецыялістаў, — тлумачыць Алена Пляскова.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Дыспансерызацыя ўключае прафілактычныя медыцынскія агляды і даследаванні. Яе мэта — як мага раней выявіць захворванні і фактары рызыкі, каб скарэктаваць лад жыцця і хутчэй пачаць лячэнне і аблегчыць ход хваробы і стан пацыента.

— Рэгулярнае праходжанне дыспансерызацыі неабходна ўсім людзям, незалежна ад стану здароўя, — тлумачыць **галоўны ўрач 11-й гарадской паліклінікі Наталія АМЕЛЬЯНОВІЧ.** — Нават калі людзі лічаць сябе здаровымі, падчас дыспансерызацыі ў іх нярэдка выяўляюцца небяспечныя неінфекцыйныя хваробы, лячэнне якіх найбольш эфектыўна на ранняй стадыі. Даводзілася чуць меркаванне, што гэта мерапрыемства праводзіцца фармальна і мала што дае. Тым не менш ахвотных прайсці бясплатна прафілактычныя агляды і атрымаць кансультацыі ўрача становіцца ўсё больш. Але пацыенты выказваюць заўвагі, што ў паліклініцы або немагчыма прайсці агляд за адзін дзень, або вялікія чэргі да пэўнага спецыяліста. Таму мы арганізоўваем выхады ўрачоў на прамысловыя прадпрыемствы і ў інтэрнаты, размешчаныя на тэрыторыі абслугоўвання нашай паліклінікі. Калі ласка, прыходзьце, здавайце аналізы, атрымлівайце кансультацыю і пры неабходнасці — накіраванне да вузкага спецыяліста.

Вынікі першага дня працы медыкаў на ААТ «Камволь» пацвярджаюць словы Наталіі Амельяновіч: некаторым работнікам рэкамендавана звярнуцца да спецыялістаў, каб прайсці больш паглыбленае абследаванне ці атрымаць лячэнне. У 11 работнікаў з 35 выявілі павышаны ціск, прычым у двух — упершыню, тром жанчынам па выніках агляду малочных залоз рэкамендавана прайсці мамаграфію, трох па выніках ЭКГ накіравалі на кансультацыю да ўрача-кардыёлага, у аднаго з агледжаных выяўлены высокі ўзровень цукру ў крыві.

— Нездарма дыспансерызацыя праводзіцца пад дэвізам «Дапамажыце нам дапамагчы вам», — кажа Наталія Амельяновіч. — Звяртаць увагу і прыслухоўвацца да свайго арганізма трэба пастаянна. І нават з нязначнымі на ваш погляд праблемамі важна звяртацца да ўрача, каб не запускаць хваробу, а своечасова пачаць лячэнне.

# ЭФЕКТ «МАТЫЛЬКА»

## Як не нашкодзіць шчытападобнай залозе

**Летась у Беларусі зарэгістравана 324 тысячы хворых з паталогіямі шчытападобнай залозы. Анкалогію штогод выяўляюць у 1100 пацыентаў. Як часта трэба абследаваць залозу, якая ўплывае на работу ўсяго арганізма? Якія прадукты і прэпараты яна не любіць? Чым дапамагла нам ёдная прафілактыка і хто пасля чарнобыльскай катастрофы дагэтуль у групе рызыкі?**

### Колькасць захворванняў расце

Паталогіі шчытападобнай залозы ў структуры захворванняў эндакрыннай сістэмы ва ўсім свеце знаходзяцца на другім месцы пасля цукровага дыябету. У нашай краіне агульная захваральнасць шчытападобнай залозы на працягу апошняга дваццацігоддзя паступова зніжаецца. Адбываецца гэта за кошт змяншэння самага простага захворвання — нетаксічнага валляка. За 20 гадоў яго колькасць знізілася ў чатыры разы. (Дасягнуць гэтага ўдалося дзякуючы мерапрыемствам, якія праводзіліся пасля чарнобыльскай катастрофы, у прыватнасці, масавай ёднай прафілактыцы.) Колькасць жа астатніх паталогій пакуль працягвае істотна расці.

Паводле інфармацыі **намесніка галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Вольгі САЛКО,** значны рост дэманструе гіпатырэоз — стойкі дэфіцыт гармонаў шчытападобнай залозы ў арганізме з-за зніжэння яе функцыі. За апошнія 20 гадоў у дарослых ён вырас у восем разоў, у дзяцей — у 16. Павышаецца і колькасць аўтаімунных хвароб, у прыватнасці гіпертырэозу, або дыфузна-таксічнага валляка. Павялічваецца колькасць пацыентаў з вузлавым валляком — у чатыры разы за два апошнія дзесяцігоддзі, а таксама розных формаў тырэадыту — у два разы.

Пры гэтым Беларусь зусім не на першым месцы ў свеце па колькасці паталогій шчытападобнай залозы. Лідарамі з'яўляюцца ЗША, Паўднёвая Карэя і Францыя. Дзве апошнія краіны маюць вялікую колькасць атамных станцый, а ЗША праводзілі наземныя выпрабаванні ядзернай зброі. Узровень захваральнасці ў нас прыкладна такі ж, як у Польшчы і Германіі.

### Прагнозы ў лячэнні станоўчыя

Паводле даследаванняў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, пасля чарнобыльскай катастрофы адбыўся ўсплёск анкалогіі толькі адной лакалізацыі — шчытападобнай залозы. Адбылося гэта ў рэгіёнах, забруджаных радыёнуклідамі. З 1992 года ў Беларусі працуе Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр пухлін шчытападобнай залозы. І ў апошнія гады, паводле слоў **загадчыка кансультатыўна-дыягнастычнага аддзялення тыроіднай паталогіі Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Таццяны ЛЯВОНАВАЙ,** захваральнасць застаецца на адным узроўні. Штогод у 1100 пацыентаў упершыню выяўляецца рак шчытападобнай залозы, сярод іх прыкладна 35 дзяцей, у якіх хвароба ўзнікае, хутчэй за ўсё, выпадкова. А 22 тысячы беларусаў стаяць на ўліку пасля хірургічнага ўмяшання па прычыне анкалогіі.

— За апошнія 20 гадоў колькасць выпадкаў захворвання на рак шчытападобнай залозы вырасла ў два разы ва ўсім свеце, — кажа Таццяна Лявонава. — У першую чаргу гэта звязана з тым, што наладжана сістэма дыягностыкі і павысілася выяўляльнасць. Любы спецыяліст — эндакрынолаг, анколаг — накіроўвае пацыента, калі ёсць прыкметы злаякаснага працэсу, на дадатковае абследаванне і аперацыю. Пухліна шчытападобнай залозы, якая сама па сабе мае форму матылька, не ўплывае на працаздольнасць жыцця, а прагнозы ў яе лячэнні вельмі станоўчыя.

— Радыяцыйна індуцыраваныя формы раку малаагрэсіўныя, — дадае **загадчык кафедры эндакрыналогіі БелМАПА Ларыса ДАНІЛАВА.** — Усе баяцца раку, але мала хто ведае, што пасля 40 гадоў 75 % людзей маюць вузлавыя ўтварэнні шчытападобнай залозы, а ў некаторых папуляцыях гэта лічба дасягае 80 %. І толькі 5 % з іх — злаякасныя. Вузлавыя ўтварэнні ў дзіцяці павінны насцярожваць, а ў жанчыны пасля 50 гадоў — гэта нармальная з'ява.

### Каму, дзе і як абследавацца

Спецыялісты не вітаюць масавых абследаванняў шчытападобнай залозы. Ультрагукавую дыягностыку не трэба рабіць усім запар. На абследаванне павінен накіраваць урач, калі бачыць нейкія змяненні. Маніторынг рэкамендуецца праводзіць толькі пэўным групам рызыкі. У прыватнасці, дзецям, калі ў іх раней выяўлялася паталогія залозы ці калі яны адстаюць у росце. А таксама тым, хто на момант чарнобыльскай аварыі быў дзіцем да 18 гадоў. Не лішне правярыцца і тым, у каго блізкія сваякі апераваліся па прычыне раку шчытападобнай залозы. Раз на два гады ў такім выпадку трэба праходзіць ультрагукавую дыягностыку. Тое самае датычыцца і праверкі гармонаў або тыроіднага статусу. У прыватнасці, яна неабходная жанчынам, якія мелі сур'ёзныя гінекалагічныя аперацыі.

**Захапляцца салатай з марскіх водарасцяў не варта, бо лішак ёду таксама неспрыяльны для шчытападобнай залозы.**

— Канешне, калі гаворка ідзе пра дзіця ці жанчыну рэпрадуктыўнага ўзросту, тут паказчыкі тыроіднага статусу павінны быць ідэальнымі, калі гаворка ідзе пра немаладога пацыента, то мэты тыроіднага статусу зусім іншыя, — тлумачыць Ларыса Данілава.

У Беларусі пабудавана дакладная сістэма выяўлення хвароб шчытападобнай залозы. На пярвічным узроўні, а гэта гарадскія і раённыя паліклінікі, ёсць усе ўмовы для маніторынгу: УГД-дыягностыка і гарманальныя абследаванні. Часцей за ўсё хворыя спыняюцца на гэтым узроўні і назіраюцца ў эндакрынолага. Калі неабходная пункцыйная біяпсія шчытападобнай залозы, хворага накіроўваюць на наступны — міжраённы, гарадскі, абласны ці рэспубліканскі ўзровень, дзе мэтанакіравана дыягнастуюць вузлавыя паталогіі і вырашаецца пытанне аб хірургічным умяшанні.

### Чаго яна не любіць

Для гэтай эндакрыннай залозы важнае здаровае харчаванне. Аднак захапляцца салатай з марскіх водарасцяў не варта, бо лішак ёду таксама неспрыяльны для шчытападобнай залозы. Тое, што на яе дрэнна ўплываюць капуста і жамчужнае проса, — вялікі міф. Грэцкія арэхі ў цэлым карысныя для нашага арганізма, але ёд з іх у шчытападобную залозу не паступае, таксама як ён не паступае і з марскога паветра. А вось што сапраўды шкодзіць нашай шчытападобнай залозе, дык гэта курэнне, дэфіцыт бялку, антыбіётыкі і сульфаніламідныя прэпараты. А таксама так званыя эндакрынныя дызраптары — пестыцыды, гербіцыды, фталаты і іншыя рэчывы, якія, трапляючы з асяроддзя ў арганізм, звязваюцца з рэцэптарамі гармонаў і парушаюць работу шчытападобнай залозы. Часта парушэнні функцыі шчытападобнай залозы маюць людзі, хворыя на цукровы дыябет ці ў стане, які яму папярэднічае. Таму важна сачыць за сваёй вагой і прадуктамі, якія ўжываецце.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

■ Імпартазамяшчэнне

# ГРЫБЫ ЛЮБЯЦЬ РУКІ

## У Шчучыне будуецца буйная фабрыка па вырошчванні шампіньёнаў

**Гэта не першая спроба наладзіць па Прынёманні вытворчасць гэтых грыбоў. Некалькі захадаў было зроблена ў Гродзенскім раёне. Тут прадпрымальніку была выдзелена зямля і складзены інвестдагавор. Але справа ў рэшце рэшт зайшла ў тупік. Такі ж лёс напаткаў і яшчэ адзін аналагічны праект. Таму чарговую прапанову з боку расійскага інвестара абласныя ўлады сустрэлі з сумненнем.**



— Так, сітуацыя з папярэднімі праектамі мне вядома, — адразу заўважыў **дырэктар кампаніі «ЛОГАЛ-БИО» Аляксандр АЛЕЙНІКАЎ.** — Мы ж укладваем сур'ёзныя інвестыцыі — восем мільёнаў рублёў — і маем намер замяніць увесь імпарт шампіньёнаў у рэспубліцы.

Фабрыка будуецца, і даволі хуткімі тэмпамі. Першая чарга будзе запушчана значна раней за праектны тэрмін. Урачыстае адкрыццё прымеркавана да Дня незалежнасці нашай краіны.

— Мы выйшлі на будаўнічую пляцоўку першага кастрычніка мінулага года, і сёння ўжо зроблена каля 80 %, — расказаў суразмоўнік. — У нас запушчана ўласная кацельня, загадзя пракладзены інжынерныя камунікацыі. Мы пачалі з інфраструктуры, правялі пад'язныя дарогі, электрыку.

Такі падыход, лічыць інвестар, палова поспеху. Нельга прыйсці на пляцоўку і потым збіраць паперы, узгадняць і чакаць выніку. Вялікае значэнне мае і дапамога мясцовых улад. Інвестару аказваецца значная падтрымка, паведамілі ў аддзеле эканомікі Шчучынскага райвыканкама. Асабліва, што датычыцца афармлення тэхнічнай дакументацыі. Інвестара тут добра ведаюць, бо гэта другі праект, які кампанія рэалізуе на тэрыторыі раёна. Першым стала сонечная электрастанцыя, яна пачала дзейнічаць два гады таму.

Для новага аб'екта прапанавалі базу былога аэрадрома. Пад фабрыку адвялі чатыры гектары. На гэтым участку будуць узведзены два даволі буйныя модулі. Мяркуецца, што праект акупіць сябе за 4,5 года.

Дарэчы, да новай справы інвестар прыйшоў падрыхтаваны. Па словах Аляксандра Алейнікава, яны 1,5 года вывучалі вопыт польскіх партнёраў, наведалі шматлікія фабрыкі. Між іншым, Польшча лічыцца самым буйным вытворцам шампіньёнаў у Еўропе. На фабрыцы ў Шчучыне будуць задзейнічаны менавіта новыя тэхналогіі з сістэмай кандыцыянавання. З Польшчы будзе пастаўляцца і кампост з міцэліямі — глеба для вырошчвання грыбоў. Кампост пасля збору ўраджаю поўнасцю аднаўляецца, але скарыстаны таксама не трапіць у адходы. Яго бясплатна аддадуць сельгаспрадпрыемствам для выкарыстання ў якасці ўгнаення.

Першая закладка сыравіны запланавана на другую палову ліпеня, а ўраджай паспее менш чым за месяц, — адзначае Аляксандр Алейнікаў. — Гандляваць плануем на тэрыторыі Мытнага саюза, у асноўным будзем адпраўляць у Расію. Спадзяёмся, што і ў Беларусі павысіцца попыт на карысны грыб, Даступным коштам будзем развіваць гэту культуру на айчынным рынку.

Пасля таго як увесь комплекс пачне дзейнічаць, магутнасць яго складзе 2,5 тысячы тон грыбоў у год. Адзначым, што многія віды работ па тэхналогіі не патрабуюць працоўных рук, напрыклад, загружаць кампост будзе спецыяльны камбайн, тэмпературу і вільгасць забяспечаць кліматычныя ўстаноўкі, паліў будзе аўтаматычны. А вось збор грыбоў — толькі ўручную. Спецыяльныя машыны могуць збіраць грыбы для перапрацоўкі, а каб данесці свежы прадукт да спажыўца, неабходны рукі, пераважна жаночыя. Замежны вопыт паказаў, што лепшыя спецыялісты па зборы грыбоў — менавіта жанчыны. Шанц атрымаць работу з'явіцца для многіх жыхароў Шчучына і наваколля. Тут будзе створана 100 працоўных месцаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

■ Нерухомасць

# Амаль 10 млн USD за 16 га

## Участак рынку «Лебядзіны» прададзены пад будаўніцтва жылля за 20 мільёнаў рублёў

**У Мінскім гарадскім цэнтры нерухомасці адбыліся таргі па продажы зямельнага ўчастка па вуліцы Ціміразева. Зямля плошчай 16,3 гектара, на якіх ужо шмат гадоў працуе «Лебядзіны» і плодаагародніння рынкі, прададзена маловядомай кампаніі ТАА «Сетко Інтэрнэшнл».**

Выніковая сума аўкцыёну — 20 мільёнаў рублёў. Пераможца павінен будзе запраектаваць увесь участак каля заказніка «Лебядзіны» — усе 16,3 гектара.

Канцэпцыя праекта «Жылы комплекс з аб'ектамі сацыяльна-грамадскага прызначэння па вул. Ціміразева» прадугледжвае будаўніцтва малапавярховай жылой забудовы з паніжэннем павераховасці ў бок заказніка «Лебядзіны».

На тэрыторыі мяркуецца вялікі працэнт азелянення. Тут павінны з'явіцца школа і дзіцячы садок — іх будзе будаваць горад.

Усяго на адведзеным участку павінны ўзвесці 60 тысяч квадратных метраў жылля — гэта каля тысячы кватэр.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Фінансавы выдатнік

# ФОКУС КАПІТАНА З ТРЫМА МЯЧАМІ

## У сталіцы прайшоў семінар па фінансавай адукаванасці са спартыўным акцэнтам

**Банкіры МТБанка аб'ядналіся з баскетбольным клубам «Цмокі-Мінск» і правялі мерапрыемства па «грашовай» тэматыцы ў фінансава-эканамічным каледжы пры БДЭУ.**



Спачатку супрацоўніца банка Кацярына Пласкавіцкая расказала навучэнцам першага курса спецыяльнасці «Банкаўская справа» аб фінансах, асаблівасцях крэдытных і дэпазітных прадуктаў, аб правілах бяспечных плацяжоў, а таксама пра тое, як правільна выбраць банкаўскую картку. Спецыяльнасць студэнтаў абумоўлівала іх глыбокае жаданне паглыбіцца ў свет фінансаў, яны актыўна задавалі эксперту пытанні на розныя тэмы.

«Для сучасных хлопцаў і дзяўчат выдатна падыходзіць такі фармат, яны актыўна прымалі ўдзел у абедзвюх частках нашага семінара. Здаровы лад жыцця не менш важны, чым фінансавая адукаванасць, а спалучэнне гэтых двух фактараў дазволіць ім вырасці развітымі і гарманічнымі», — расказаў **Іван ВЯРЭНІЧ, брэнд-менеджар МТБанка.**

Фінансавая частка семінара плаўна перацякла ў спартыўную. **Капітан баскетбольнага клуба «Цмокі-Мінск» Аляксандр КУДРАЎЦАЎ** нагадаў юнакам і дзяўчатам аб карысці заняткаў спортам і здаровага ладу жыцця, адказаў на пытанні і правёў размінку. Дзіўна, але поспехі ў баскетболе ў студэнтаў нічым не саступалі поспехам на фінансавым полі.

«Нягледзячы на тое, што аўдыторыя аказалася практычна цалкам жаночай, выяўленая цікавасць да баскетбола была прыемнай. У час размовы дзяўчат, вядома, больш цікавіла маё асабістае жыццё і сумяшчэнне яго з прафесійным спортам. Пагаварылі і пра фінансы, бо ў спартзале сабраліся будучыя эканамісты. Мы добра пагутарылі, а потым нават крыху пагулялі. Буду чакаць хлопцаў і дзяўчат на нашых матчах у наступным сезоне», — падзяліўся Аляксандр Кудраўцаў. У канцы сваёй своеасаблівай трэніроўкі кумір спартыўных балельшчыкаў паказаў фірмовы фокус з баскетбольнымі мячамі. Ён імі жангляваў, прафесійна, як у цырку, толькі мячы былі вялікімі, баскетбольнымі ...

Мерапрыемства завяршылася сумесным фота і ўручэннем усім удзельнікам памятных прызоў ад банка і баскетбольнага клуба.

**Сяргей КУРКАЧ**

# КАЛІ ДА ПАЖАРУ — АДНА КРОПЛЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Людзі забываюць, што нельга выкарыстоўваць бензін, керасін, дызельнае паліва, ацэтон і іншыя арганічныя вадкасці для распальвання вогнішчаў, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Яны спакушаюцца на тое, што з іх дапамогай можна вельмі хутка распаліць агонь. Часцей за ўсё можна атрымаць апёк наступным чынам. Сабралася кампанія на пікнік, вырашылі падсмажыць шашлыкоў на мангале, а спецыяльная вадкасць для полымя скончылася. Ехаць кудысьці ў краму па яе ляянуюцца. Ды і навошта, калі ў каністры ў багажніку плешчацца бензін? І вось хтосьці шчодра палівае ім вуголле і падносіць запалку. Што далей — глядзіце фільмы жахаў пра людзей, якія ператвараюцца ў жывы факел. Небяспеку ўяўляе па́ра, якая імкліва распаўсюджваецца ў паветры. І калі ў рухавіку аўтамабіля згарае паліва-паветраная сумесь, то чаму яна не можа тады загарэцца па-за яго межамі?

Яшчэ адна распаўсюджаная прычына пажараў з-за лёгкаўзгаральных вадкасцяў — неахайнасць пры рамонце аўтамабіля. Некалькі кропляў паліва або алівы могуць лёгка трапіць падчас маніпуляцый на ратку. Яны як быццам бы і не заўважныя з першага позірку, але... Пасля чалавек разводзіць полымя — і яно вокамгненна перакідваецца на вопратку. Таму пасля любога кантакту з палівам вопратку трэба змяніць і толькі пасля брацца за запалкі.

Небяспеку хавае ў сабе і няправільнае захоўванне гаручага. Напрыклад, пэўныя запасы бензіну і алівы патрэбны для трымера для прысядзібнага ўчастка. А таму гаспадарчыя пабудовы і гаражы ператвараюцца ў склад розных рэчываў, сярод якіх ёсць і пажаранебяспечная вадкая арганіка.

— У тары, якая знаходзіцца ў памяшканні, можа быць наліта сумарна не больш за 20 літраў паліва, — працягвае Анастасія Швайбовіч. — Пры гэтым яно мусіць захоўвацца выключна ў металічных ёмістасцях, якія наглуха закрыты. Пры гэтым трэба разумець, што стан праводкі ў гаражы ці павеці мусіць быць ідэальным. Сярод іншага, яна павінна быць абавязкова праведзена ў штробах, каб выключыць усялякую магчымасць пападання ад яе іскры. Ну і, вядома, пра курэнне там давядзецца забыць.

Утварыць пажар з-за лёгкаўзгаральных вадкасцяў можа нават малое ў звычайнай гарадской кватэры. Нават калі ў бацькоў няма аўтамабіля, то хоць нейкая аэразоль у ванным пакоі стаіць заўжды. І калі такім балончыкам «пшыкнуць» на полымя, то полымя разгарыцца ўмомант. Таму дэзадаранты, лак для валасоў і іншыя падобныя рэчы трэба прыбраць як мага вышэй, каб дзіця не здолела дацягнуцца да яго, нават падставіўшы крэсла.



А што ж рабіць, калі бензін усё ж загарэўся? Справа ў тым, што прадукты нафтаперапрацоўкі нельга тушыць вадой. Іх шчыльнасць меншая, і таму яны будуць проста плаваць па яе паверхні. Ды і плошча пажару будзе імкліва павялічвацца з-за расцякання. Таму там, дзе выкарыстоўваецца вадкая арганіка, мусіць стаяць або скрыня з пяском, або парашковы вогнетушыцель як мага большага аб'ёму.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**



Іван ШАЛКОВІЧ — матрос на паромнай пераправе «Снядзін».



# СНЯДЗІН І СНЯДЗІНЦЫ





Пенсіянерка Ніна ЗАНКЕВІЧ і яе тэхналогія вырошчвання памідораў.

Вёска Снядзін пад Петрыкавам знаходзіцца на самым беразе Прыпяці, і рэдка калі ў час вясновых паводак вада не падбіраецца да самых дамоў. Сёлета паводка таксама наблізілася да населенага пункта, папужала пенсіянераў, якіх тут большасць, нагадала ім пра мінулыя бедствы. Але спынілася, не пайшла нязваным госцем у хаты ды хлявы. І ўсё-ткі да самай сярэдзіны мая Снядзін быў адрэзаны ад свайго райцэнтра, пакуль не запрацаваў паром. Галоўная дарога па-ранейшаму застаецца цераз Прыпяць.

— Калісьці тут былі сельскі Савет, саўгас, свая леспрамгасаўская пякарня, вузкакалейка, школа, медыцынская ўстанова, некалькі крам, — мы жылі багата, лічы, пры камунізме, — з гонарам і ў той жа час з горыччу ў голасе кажуць вяскоўцы пра сваю малую радзіму. — Толькі цяпер гэта зразумелі... А вясновая паводка вялікай бяды не чыніць — вада прыходзіць і сыходзіць.

На лавачцы каля дома нумар трынаццаць, дзе жыве старэйшына вёскі і сацыяльны работнік Валянціна Кірыловіч, збіраюцца аднавяскоўцы. Такая вось завядзёнка, можна сказаць, традыцыя — пабачыцца, пагаварыць, па-суседку паплакацца. Часам і паспяваць — успомніць палескі фальклор. Цяпер пенсіянеры з нецярплівасцю чакаюць лета: у час школьных канікулаў вёска, як у былыя часы, напоўніцца дзіцячымі галасамі.

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**

***Больш здымкаў і відэа глядзіце на сайце zviazda.by***



Марыя ДАМАСЕВІЧ — выканаўца народных песень-балад.



Стараста вёскі Валянціна КІРЫЛОВІЧ *(у цэнтры)* са сваімі суседзямі.



Дзмітрый РУБЧЭЎСКІ на ўласным трактары дапамагае аднавяскоўцам на сяўбе.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 235,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422080407101000085, площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), находящемся по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Начальная цена продажи – 71 280 руб. (семьдесят одна тысяча двести восемьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 7 128 руб. (семь тысяч сто двадцать восемь рублей)

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 14 июня 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.01.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 11 июня 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

---

Утерянные страховые полисы добровольного страхования от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА 0977565, 1246634 страховой компании «Промтрансинвест» считать недействительными.

---

**ЗАСО «Промтрансинвест»** предлагает принять участие **05.06.2018** в процедуре переговоров по выбору подрядной организации для выполнения комплекса работ по объекту «Капитальный ремонт с модернизацией систем отопления и водоснабжения помещений представительства ЗАСО «Промтрансинвест» в г. Минске № 1 по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 142. Тел. (017) 228 14 69.

УНП 100357923

---

## Извещение о реализации недвижимого имущества ОАО «Барановичидрев», имеющего высокий износ. 9-е повторные торги по Лотам № 8 – 10 000,00 рублей, № 9 – 30 000,00 рублей

**Состоятся 12 июня 2018 года в 14.00.**

Торги состоятся по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

Цена Лотов №№ 8, 9 установлена ликвидационной комиссией, без НДС и снижена на 50 % от цены, установленной на 6 повторных торгах.

Сумма задатка: 10 % от начальной цены Лотов в рублях РБ.

Получатель платежа: 225410, ОАО «Барановичидрев», г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, р/с BY68BPSB30121226161389330000; БИК BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск; УНН 200299909.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по ЛОТАМ №8, 9 в срок до 14.00 07.06.2018 года организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу:

**225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».**

Конт. тел.: 8 029 6332490 vel, (029) 8248026 МТС, факс (0163) 455124.

E-mail: mischuk_am@mail.ru.

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

**Дополнительным условием** к ЛОТАМ №№ 8, 9 для победителей торгов является обязательное предварительное заключение отдельного договора купли-продажи имеющегося на приобретаемой территории асфальтного покрытия, ограждения (забора), ворота, зеленых насаждений, коммуникаций и прочего имущества по данным бухгалтерского учета.

**Обременением** к ЛОТУ № 9 для победителя торгов является обязательное условие сохранения прав ликвидационной комиссии и антикризисного Управляющего (в банкротстве) в части безвозмездного использования помещения проходной, являющейся составной частью Лота № 9, до завершения процедуры банкротства и выведения должника из ЕГР РБ.

Торги осуществляются в соответствии с постановлением СМ РБ № 16 от 08.01.13.

**Более подробно с условиями и объектами аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 01.06.2018 года.**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже базы отдыха «Чечели», принадлежащей унитарному предприятию «Агробизнесконсалт»

**Лот № 1.** База отдыха «Чечели» в составе 114 объектов движимого и недвижимого имущества (перечень имущества приведен на сайте организатора аукциона www.ino.by), расположенная по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Обрубский с/с, д. Чечели. **Начальная цена с учетом НДС (20 %) – 720 000,00 бел. руб. Задаток – 36 000,00 бел. руб.**

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,6887 га с кадастровым номером 221584208601000059. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для использования под базу отдыха «Чечели». Право аренды. Срок действия: по 02.03.2035. ОГРАНИЧЕНИЯ (обременения) прав: ограничения в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, площадь 0,5315 га; ограничения в прибрежных полосах водных объектов, площадь 0,1572 га; ограничения в охранных зонах линий электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадь 0,0526 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Земельный участок площадью 0,0919 га с кадастровым номером 221584208601000060. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для использования под базу отдыха «Чечели» (скважина). Право аренды. Срок действия: по 02.03.2035. ОГРАНИЧЕНИЯ (обременения) прав: ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, площадь 0,0919 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Земельный участок площадью 0,2049 га с кадастровым номером 221584208601000061. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для использования под базу отдыха «Чечели». Право аренды. Срок действия: по 02.03.2035. ОГРАНИЧЕНИЯ (обременения) прав: ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, площадь 0,2049 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Лота № 1 в течение 60 (шестидесяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % (одного процента) от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 04.07.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 1 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона *www.ino.by*.

**Продавец:** унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, д. 22, оф. 1703.

**Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже базы отдыха «Чечели», проводимом 4 июля 2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений** 28.06.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Директор унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» Шилович Алексей Николаевич, тел.: +375 (17) 288-60-03, +375 (44) 712-50-51. Пн.–пт. с 8.30 до 17.30.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

## Извещение о проведении 15 июня 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008 | 4101080 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 4 600,00 | 460,00 |
| 2 | Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008 | 4101081 | | 4 600,00 | 460,00 |

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

